Пролетарыі всех стран, соединяйтесь! פּראָלעטאַריער פון אַלע לענדער פאַראייניקט זיך! Proletarjusze wszystkich krajów, łączcie się! Пролетары усіх краёў, злучайцеся!

УМОВЫ ПАДПІСКІ:
На 1 м-ц—90 к.; на 3 м-цы—2 р. 60 к. на 6 м-цаў—5 р.; на 1 год—9 р. 75 к.
Зьмена адрасу: м[illegible] нумара—10 к., іншагароднага—20 кап.
Падпіска і абвесткі прымаюцца: У Гал. Канторы газ. „Зьвязда"—г. Менск, Са[illegible] 63, трэці паверх, ад 9 гадз. раніцы да 3-х гадз. дня. У акруговых гарадох—у Бел. Дзярж. Выдавецтва і ва ўсіх пашт.-тэл. канторах.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ:
За радок нонпарэлі (пасьля тэксту) 50 кап. Для Масквы і Ленінграда [illegible]
Пасярод тэксту у два разы д[illegible]
Пры шматразовым друкаваньні— па згодзе.
Згодна пост. СНК ад 10 верасьня 19[illegible] бярэцца зьверх тарыфу 10 проц. пада[illegible]

РЭДАКЦЫЯ—Г. МЕНСК, САВЕЦКАЯ, 62.

# ЗЬВЯЗДА

Орг[illegible] комітэту камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі і Мен. АК КП(б)Б.

РЭДАКЦЫЯ І ГАЛОЎН. КАНТОРА.
1) Рэдактар прымае ад 11—1 гадз. дня; тэлефон № 10-74. 2) Сакратар рэдакцыі—ад 12 да 2-ое гадзіны дня, тэл. № 6-19. 3) Начны рэдактар (друкарня) ад 6 гадз. веч. тэл. № 6-42
Кіраўн. Гал. Кантораю Кантора абвестак і падпіскі } тэл. № 781.

ПЯТНІЦА, 13 СТУДЗЕНЯ 1928 г.
№ 11 (2818)
Кошт асобнага нумару ўсюды 5 кап.
Год выданьня дванаццаты.

Одесской Губернатора 13, Одесской Губернской Публичной Библиотеки

## НЯ МЕНШ МІЛЬЁНУ.

Ужо даўно ўсім вядом, што тая дапамога, якую дзяржава робіць каапэрацыі і надалей будзе рабіць, —невыстарчальна ў параўнаньні з тымі задачамі, якія стаяць перад каапэрацыяй, і што хутчэйшае вырашэньне гэтых задач магчыма будзе толькі ў тым выпадку, калі само жыхарства, самі пайшчыкі сапраўды і ўсур'ёз зразумеюць гэта і ўмацуюць каапэрацыйны пявы капітал.

Кепска, нядбайліва адносяцца пайшчыкі да сваіх каапэратываў. З рук прэч кепска. Гэтыя адносіны трэба зараз-жа ў корані перагледзець. Стаўшы пайшчыкам, трэба ўмець выконваць свае абавязкі ў адносінах да каапэратыву і, у першую чаргу, акуратна ўносіць паявыя ўзносы. Пайшчыкі камуністыя і актывістыя павінны паказаць прыклад і безадкладна поўнасьцю ўнесьці свае паі.

У бягучы час выдан закон аб пераходзе ўсіх спажывецкіх каапэратываў на 10-рублёвы пай. У працягу бліжэйшых месяцаў гэты пераход павінен быць ажыцьцёўлен. Між тым, сярэдні фактычна аплачаны пай па спажывецкай каапэрацыі ў БССР дасягае ўсяго толькі 2 р. 80 к. Па розных с.-г. каапэратывах ён хістаецца ў той-жа норме і амаль нідзе не перавышае 3 р. 50 к. Гэта надзвычайна нізкая лічба, якая гаворыць аб тым, што вялізарная маса нашых пайшчыкаў ня выконвае свайго першага і асноўнага абавязку.

З рук прэч кепска адносяцца да сваіх абавязкаў (зьбіраньне паёў, нагляд за акуратным пакрыцьцём узносаў, своячасовую аплатаю адтэрмінаваных узносаў) і самі каапэрацыйныя працаўнікі. Маючы магчымасьць весьці сваю гандлёвую праду на сродкі, на крэдыты, адпушчаныя ім дзяржаваю, многія з іх літаральна ні аб чым ня дбаюць, замест таго, каб сапраўды паклапаціцца аб зборы сродкаў самога жыхарства і, у першую чаргу, паёў.

Калі можна часам дараваць таму ці іншаму пайшчыку, часам малаасьвядомаму, гэткія яго адносіны да выкананьня сваіх абавязкаў, дык гэтага зусім нельга дараваць тым, хто карыстаецца давер'ем жыхарства, пайшчыкаў і кіруе тым ці іншым каапэратывам, на каго ўскладзены непасрэдны абавязак клапаціцца аб умацаваньні каапэратыву, аб пашырэньні яго працы.

Цэнтральны каапэрацыйны савет **прызнаў становішча з паявымі ўзносамі нядобраспагадлівым.** Ён даў баявую задачу на лініі сельска-гаспадарчай і спажывецкай каапэрацыі: у працягу другое квадры ўцягнуць ад жыхарства ў каапэрацыю праз узнос паёў ня менш аднаго мільёну рублёў.

**Гэтае заданьне павінна быць безагаворачна выканана ў вызначаны тэрмін.**

Па выніках выкананьня гэтага заданьня мы будзем меркаваць аб працаздольнасьці і прыгоднасьці таго ці іншага працаўніка для каапэрацыйнай працы.

Заданьне ў адзін мільён рублёў разьмяркована між асобнымі саюзамі спажывецкай і с.-г. каапэрацыі. Яны ў сваю чаргу на кожнае спажывецкае таварыства, на кожны с.-г. каапэратыў усклалі пэўную частку гэтае сумы.

Пад асабістую адказнасьць старшынь тых або іншых каапэратываў гэтае заданьне павінна быць выканана ўсімі без выключэньня. Для выкананьня гэтае задачы кожнае праўленьне каапэратыву павінна абмежаваць адтэрмінаваньне ўзносу паёў ня больш, як 3-мя месяцамі. Неабходна безадкладна перагледзець сьпісы пайшчыкаў, якім былі дадзены адтэрмінаваньні і, у выпадку неакуратных узносаў імі паёў, спаганяць пратэрмінаваныя ўзносы безадкладна. Ня трэба спынацца нават перад выключэньнем злосных неплацельшчыкаў са складу пайшчыкаў каапэратыву. Зразумела, справа каапэраваньня беднаты гэтым ня згортваецца. Гэта справа павінна развівацца з тым, каб адпаведныя фонды на каапэраваньне беднаты былі поўнасьцю скарыстаны, што на практыцы не заўсёды мае месца.

Праўленьне кожнага каапэратыву павінна бе адкладна, прыцягнуўшы адзін-два дзесяткі найбольш сьвядомых пайшчыкаў, распачаць абход пайшчыкаў і збор паёў. Найбольш здольных зборшчыкаў, якія выканалі гэтыя заданьні, неабходна заахвоціць тым ці іншым відам прэм'яваньня. Трэба бе адкладна ўцягнуць увесь каапэратыўны апарат, у тым ліку і прадаўцоў, у гэту працу. **Ні адзін з служачых каапэратыву ня можа быць не занятым гэтай працай.**

Праўленьням саюзаў дадзена дырэктыва: поруч з ужываньнем рэпрэсыўных [illegible] у адносінах да каапэратываў і каапэрацыйных працаўнікоў, якія ня выконваюць гэтых дырэктыў, ужываць меры заахвочаньня як да каапэратываў (водпуск дэфіцытных тавараў, ільготны крэдыт і г. д.) так і да выяўўшых сябе працаўнікоў нізавое сеткі.

У працягу бліжэйшых месяцаў мільён руб. павінен быць сабраны поўнасьцю.

## Тэмп загатовак—на першым пляне.

### (Гутарка з наркамгандлю т. Адзмайцісам).

Хоць БССР па збожжы зьяўляецца спажывецкаю краінаю, але ў асобных акругах і раёнах бязумоўна ёсьць хлебныя лішкі. Усім добра вядома, што раёны былое Случкае акругі ў ранейшыя часы давалі вялікую колькасьць хлеба (да аднаго мільёну пудоў розных збожжавых прадуктаў).

Таксама бязумоўна ёсьць лішкі хлеба і ў некаторых другіх раёнах, як Бабруйскім, Гомельскім, Магілеўскім і, асабліва, Мсьціслаўскім раёне.

І таму мы лічым, што зацьверджаны ўрадам БССР план хлебазагатовак у 2 з паловаю мільёны пудоў хлеба зьяўляецца бязумоўна рэальным і можа быць поўнасьцю ажыцьцёўлены.

Аднак, хлебазагатоўчыя арганізацыі, як Хлебапрадукт і сельска-гаспадарчая каапэрацыя, да гэтага часу не праявілі выстарчальнай увагі да мясцовых хлебных загатовак. Досыць зазначыць хоць-бы па тое, што хлебныя раёны Случчыны ўвесь час патрабавалі завозу хлебных прадуктаў.

Дзякуючы гэтаму, мясцовыя хлебныя рэсурсы ня выбіраліся і заставаліся ляжаць без карысьці ў гаспадарках, або пападалі ў руці прыватных скупшчыкаў. Прыкмячаліся нават выпадкі, што ня толькі прыватныя скупшчыкі, але і сяляне-кулакі скуплялі хлеб і хавалі яго ў мэтах спэкуляцыі, чакаючы магчымага ўзросту хлебных цэн. Вось чаму хлебазагатоўчыя органы павінны аддаць усе сілы на загатоўку хлеба на мясцох. Мы бачым, што ў тых выпадках, калі каапэрацыя праяўляе некаторую ініцыятыву, вынікі атрымліваюцца досыць добрыя. Так, у **Хойніцкім раёне, Гомельскае акругі, каапэратыў за кароткі час загатовіў звыш 4.000 пудоў хлеба.**

У зьвязку з узмацненьнем дзейнасьці прыватніка на хлебным рынку мы праводзім шэраг мерапрыемстваў, накіраваных да зьмяншэньня гэтай дзейнасьці прыватніка і накіраваньня яго ў поўнае рэчышча, каб прыватнік не падрываў нашых плянавых загатовак.

Нам яшчэ трэба будзе павесьці барацьбу з надзвычайна небясьпечным зьявішчам—выганкаю самагону, што зьнішчае вялікую колькасьць хлеба. З месц ідуць весткі аб тым, што самагонакурэньне ўзмацняецца і ў тыя-ж часы барацьба з гэтым зьявішчам вядзецца зусім слабая. Досыць красамоўным фактам зьяўляецца тое, што на ўсебеларускім літоўскім зьезьдзе, які адбыўся ў Менску, дэлегаты прывезьлі з сабою паказы сялянскіх сходаў, у ліку якіх быў пункт з патрабаваньнем ад ураду БССР ужыць энэргічныя меры па барацьбе з самагонакурэньнем. Мясцовая ўлада — раённыя выканкомы, с.-с. а таксама міліцыя і судовыя органы павінны неадкладна павесьці рашучую барацьбу з гэтым зьявішчам

У адносінах загатоўкі сырцу трэба падкрэсьліць, што паступленьне ільну за першы квартал гэтага году прайшло **нездавальняюча (каля 80 проц. выкананьня квартальнага пляну).** Наркамгандаль БССР, зьвярнуўшы на гэта ўвагу загатоўчых органаў, з другога боку, зрабіў усё неабходнае да больш поўнага насычэньня ільнаводных раёнаў збожжам і прамтаварамі. У прыватнасьці, намі будзе праведзена наступнае новае мерапрыемства: **тыя сяляне, якія будуць даваць лён, будуць забясьпечаны на гэтую суму мануфактураю і хлебам.**

У адносінах іншых відаў сырцу нашы загатоўчыя органы ня ўсюды раскачаліся. У той час, як некаторыя раёны правялі **досыць інтэнсыўную загатоўку экспартнага сырцу (Бабруйскі акруговы спажывецкі саюз), другія раёны (як Віцебскі і Гомельскі акруговыя сельсаюзы) вельмі вяла праводзяць загатоўчую працу. Паводле атрыманых намі вестак, нізавая сельска-гаспадарчая сетка Віцебскае акругі не атрымала нават ад свайго акруговага сельсаюзу канкрэтных указаньняў і інструкцый аб загатоўцы экспартнага сырцу.**

**Мы ўжывем і ўжываем усе рашучыя меры да зьнішчэньня ўсякіх праяўленьняў вялясьці, інэртнасьці з боку загатоўчых органаў, якія дрэнна адбіваюцца на загатоўках** Л. Н.

## Эўропа і Амэрыка прысьпешна ўзбройваюцца.

### Англія і Амэрыка будуюць крэйсэры вялікага танажу. Аэрапляны на ангельскіх падводных лодках. Францускія мінаносцы—буйнейшыя ў сьвеце.

ВАШЫНГТОН, 11. Міністр марскіх спраў П.-А. Злучаных Штатаў—Вільбур унёс на абгаварэньне кангрэсу законапраект аб асыгнаваньні 725 мільёнаў даляраў на пабудову ў працягу 5 год 25 крэйсэраў на 10 тыс. тон, 5 авіяматак (тыпу, нядаўна пабудаванай авіяматкі „Сэратога"), 9 мінаносцаў і 32 вялікіх падводных лодак. Міністр Вільбур выступіў в матывіроўкай гэтай судабудаўнічай праграмы. Ён заявіў: „Той факт, што Англія настойвае на неабходнасьці пабудовы для сябе крэйсэраў вялікага танажу, зьяўляецца найбольш красамоўным доказам, што і мы таксама адчуваем патрэбу ў павялічэньні крэйсэрскага танажу.

Нашы купцы і фабрыканты павінны мець магчымасьць утрымліваць замежныя рынкі, на якіх мы замацаваліся, а па меры таго, як у Эўропе наладжваецца нармальнае становішча, мы павінны шукаць новыя рынкі для нашае вытворчасьці. Посьпех гэтае барацьбы шмат у чым залежыць ад прэстыжу, які стваравоць дзяржаве сучасныя крэйсэры"

* * *

**Як мы нядаўна паведамлялі, амэрыканскі міністр замежных спраў Кэлёг выступіў з прапановаю дагавору аб „вечным міры". Зьмешчаныя вышэй тэлеграмы сьведчаць аб крывадушнасьці ўсіх гэтых заяў. Пад размовы аб «міры», імпэрыялістыя ня спыняюць павялічэньня ўзброеньняў. Рост супярэчнасьцяй паміж Амэрыкай і Эўропай, асабліва паміж Амэрыкай і Англіяй, абавастрэньне барацьбы за рынкі, усё гэта прымушае імпэрыялістых ліхаманкава рыхтавацца да будучай вайны, якая няўхільна. Размовамі аб „вечным міры" імпэрыялістыя хочуць ашукаць сусьветную грамадзкую думку.**

* * *

ЛЁНДАН, 10. Газэта „Дэйлі Тэлеграф" зьмяшчае артыкул вядомага знаўцы вайскова-марскіх пытаньняў Байвотэра, які прысьвечан „адраджэньню францускага вайсковага флёту".—Новыя францускія вайсковыя судны,—піша Байвотэр,—пабудованы з хуткасьцю, якая ня мае прэцэдэнтаў. Крэйсэр вадазьмяшэньнем у 10 тысяч тон быў спушчан на ваду роўна праз год пасьля закладкі. Калі эскадра адмірала Піво наведала ў чэрвені 1927 г. Англію, усе восем суднаў, якія складалі эскадру, узбуджалі захапленьне нашых маракоў. Францускія мінаносцы ангельскага флёту. Францускія падводныя лодкі ў 3.000 тон—самыя буйныя ва ўсім сьвеце.

* * *

ЛЁНДАН, 10. „Лёндан газэт" вусім выпадкова выкрыла ангельскую вайсковую тайну. У газэце было зьмешчана паведамленьне аб назначэньні спэцыяльнае пэнсіі афіцэрам паветранага флёту, якія прыкамандыраваны да аэраплянаў, што знаходзяцца на падводных лодках. З гэтага паведамленьня выявілася, што ангельскія падводныя лодкі забясьпечаны аэраплянамі. Аэрапляны знаходзяцца ў ніжняй частцы лодак.

## Індыя ў барацьбе за незалежнасьць.

### Індыйскія сяляне адмаўляюцца плаціць непамерныя падаткі.

#### Ангельскія ўлады жорстка расправяюцца з сялянамі.

ЛЁНДАН, 6. Па зьвестках, атрыманых з Бірмы (Індыя), рух пратэсту супроць непамерных падушных падаткаў сярод сялянства набывае сур'ёзныя разьмеры. У сувязі з гэтым ангельская ўлада вастасоўвае ў адносінах да сялянства самыя жорсткія рэпрэсіі. Ужо паведамлялася аб сутыцкі паміж сялянамі і паліцыяй у паблізу ад Паунгдэ, у часе якой два селяніны былі забіты, а 6 цяжка паранены. Апошнія, больш падрабязныя, зьвесткі аб гэтым інцыдэнце паказваюць, што непасрэднай прычынаю сутычкі зьявіўся арышт аднаго з лідэраў руху Шві Хлівэ.

Шві Хлівэ быў вы вален натоўпам, які прымусіў паліцыю разьбегчыся.

Як падкрэсьлівае орган ангельскай кампартыі «Уоркерс Лайф», бор падушнага падатку зьяўляецца адным з самых любімых ангельскага імпэрыялізму мэтадаў набываньня танпай рабочай сілы. Пры дапамозе гэтага мэтаду 1.000 сялян Бірмы былі пасільна пратэгаваны і працуюць цяпер на пынкавых і спрэбных рудніках. 17.000 сялян працуюць на нафтавых промыслах, а больш 97.000 сталі фабрычнымі рабочымі.

## Арыгінальная дэманстрацыя.

### Дэлегаты Індыйскага кангрэсу ляглі на рэйкі.

**КАБУЛ, 10. Газэты паведамляюць цікавы факт барацьбы індусіх мас супроць гвалту ангельскае адміністрацыі. Нядаўна скончыўся ўсеіндыйскі нацыянальны кангрэс, але ня ўсе дэлегаты мелі магчымасьць разьехацца па дамох з тэй прычыны, што некальні вагонаў, намечаных для іх цягніка, былі прадастаўлены для перавозкі ангельскіх салдат. У знак пратэсту супроць адказу чыгуначных улад дазволіць пасадку ў гэтыя вагоны, дэлегаты кангрэсу ляглі на рэйкі і такім чынам спынілі чыгуначны рух. Пасьля двух гадзін перапынку чыгуначнага руху, патрабаваньне дэлегатаў было здавалена.**

## Тав. КАШЕН У ПАЛАЦЕ ДЭПУТАТАЎ.

### Ня гледзячы на пагрозы ўраду.

ПАРЫЖ, 11. Учора мы паведамлялі, што францускі ўрад пастанавіў ужыць усе меры, каб арыштаваць камуністычных дэпутатаў пры першым іх зьяўленьні ў палаце. Як паведамляе агэнцтва „Гавас", сёньня камуністычны дэпутат Кашэн зьявіўся ў палату дэпутатаў, свабодна прайшоў у залю пасяджэн. Зьяўленьне Кашэна абудзіла ўсеагульную зацікаўленасьць. Кашэн заявіў, што ён прыйшоў ўдзел у заўтрашнім пасяджэньні палаты дэпутатаў, якая будзе разглядаць патрабаваньні ўраду аб выдачы суду ўсіх камуністычных дэпутатаў.

## 480 справаздачных сходаў аб СССР.

БЭРЛІН, 7. Трэцяя нямецкая рабочая дэлегацыя, якая паведала СССР, ад часу свайго звароту ў Нямеччыну правяла 480 справаздачных сходаў. У цэлым радзе раёнаў створаны камітэты адзінства, якія арганізавалі справаздачныя сходы.

Адкрыты ліст членаў дэлегацыі сацыял-дэмакратаў да ЦК сацыял-дэмакратычнай партыі разышоўся ў колькасьці 30.000 экземпляраў. Орган камітэту адзінства «Эйнхэйт» набыў 1.000 новых падпішчыкаў.

Правядзеньню справаздачнай кампаніі перашкаджаюць як сацыял-дэмакраты, так і рэфармісцкія прафсаюзы і прадстаўнікі «культралевай апазыцыі», групы Рут Фішэр—Маслаў, пры гэтым зьвяртае на сябе ўвагу той факт, што палемізуючыя з дакладчыкамі сацыял-дэмакраты і прадстаўнікі групы Рут Фішэр-Маслаў карыстаюцца звычайна аднэй і той-жа аргументацыяй.

## ПАД ПРЫГОНАМ РУМЫНСКІХ БАЯР.

Працоўныя нашай Савецкай Беларусі добраведаюць абц яжкім становішчы сваіх братоў над панскім ярмом у Заходняй Беларусі.

Але мы мала знаёмы з цяжкім жыцьцём бесарабскіх сялян, якія ўжо 10 год пакутуюць пад прыгонам румынскіх баяр.

Па сканчэньні імпэрыялістычнай вайны вялікія дзяржавы—пераможцы на дзялілі між сабою здабычу і пры гэтай дзяльбе не пакінулі ў крыўдзе меншых прыслужнікаў імпэрыялізму, як Румынія, якая вавала на іх баку. Асабліва значнай здабычы „з бою" меншыя дзяржавы не атрымалі, але ўсё-ж такі Антанта іх не пакрыўдзіла, дапамагла захапіць тэрыторыі з насельніцтвам прымежных дзяржаў.

Першараднае месца між захопнікамі чужое тэрыторыі ў часе імпэрыялістычнай „дзяльбы" займае Румынія.

У 1916 годзе Румынія пры дапамозе Антанты адняла ў Баўгарыі нясповасьць Дабруджу, а крыху пазьней гвалтоўна захапіла ад Савецкай Украіны частку Бесарабіі. Прыблізна праз год Антанта дзелячы „аўстрыйскую спадчыну" яшчэ падарвала Румыніі Трансыльванію.

Такім чынам Румынія значна пашырыла свае межы за лік чужых тэрыторый і ўзяла пад сваю ўладу больш 2-х мільёнаў народу. Захапіўшыся думкай „вялікай дзяржаўнасьці" (прыкладна як і Нізеўзкі) румынскія баяры страшэнна прымячаюць надзвычайныя ім народы. На працягу 10 год мы наглядалі вялікае хваляваньне прыгнечаных народаў як бесарабцаў, так і Баўгар і Туркаў. За гэты час адбылося шмат працэсаў, якія закінулі ў турмы некалькі тысяч сялян. Неспакой на захвачаных тэрыторыях прымусіў румынскіх баяр увесьці ваенна-палявыя суды, якія крутой расправай зьнішчылі некалькі тысяч ревалюцыйна-настроеных сялян.

Каб утрымаць гнёт гэтых народаў, якім працуюць баярскі ржмы, Румынія трымае каля 50.000 жандараў. На захвачаных землях уся ўлада належыць жандару і баярыну, якія распраўляюцца з надняволеным народам.

Як раней, так і ў сучасны момант імпэрыялістычныя дзяржавы—Англія і Франція даюць поўнае патрыманьне баярскай Румыніі ў прыдушэньні гэтых народаў. Імпэрыялістыя маюць асаблівую надзею на Румынію бо апошняя стала здаўна іх паслугачом і ў сучасны момант дае надзею на правакаваньне вайны супроць Савецкага Саюзу.

І вось у студзені 1928 году спаўняецца 10 год з дня захопу Румыніяй роднай народам Савецкага Саюзу Бесарабіі. За гэты час мы наглядалі масавыя хваляваньні ў Бесарабіі. Народны гнёт выпаўняўся ў забойстве жандараў, баяраў і розных правакатараў. Гэта-ж не навіна, што ў Румыніі, як і ў Польшчы, за апошнія гады гараць маёнткі баяр-асадзнікаў. І в гэтай белой трудна весьці барацьбу. Каб стрымаць хваляваньні падняволенага народу і іменьні ягі да абчыпкаваньня Савецкім Саюзам, румынскі ўрад [illegible] барацьбу [illegible] народы. Перш[illegible] гэта (як і на ўсі капіталістычных краінах) рэпрэсіі, другі—праводзіцца асадніцтва баяраў на землях Бесарабіі, на манер Польшчы ў Заходняй Беларусі. Даведваемся з буржуазных румынскіх газэт, што ля места Добруджа ў апошнія два гады румынскі ўрад стварыў калёнізацыйны фонд вямлі ў 150.000 гектараў для перасяленьня баяр—асадзнікаў.

У Бесарабіі, для украінскай мяжы і на мяжы з Малдаўскай Савецкай Рэспублікай праводзіцца яшчэ больш зьверская палітыка. У Букавіне украінскае насельніцтва зьяўляецца прыгнечанаю нацменшасьцю і імкнецца далучыцца да савецкай Украіны. У гэтай мясцовасьці забараняецца чытаць украінскія і нават расійскія кнігі. Аб савецкіх кнігах і гаварыць нельга, бо калі ў каго знойдуць—расстрэл.

Асабліва наглядаем хваляваньні насельніцтва малдаўскае нацыянальнасьці. Гэта тлумачыцца тым, што на мяжы з імі знаходзіцца Малдаўская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка, дзе малдаване свабодна жывуць, разьвіваюць сваю гаспадарку і культуру. Увогуле, калі падагуліць вынік 10- гадовага гаспадараньня румынскіх баяр у Бесарабіі то акрамя ўціску, рэпрэсій, расстрэлаў —нічога на відаць. Аб гэтым сьведчыць упартая ревалюцыйная барацьба падняволенага народу, які чакае выгоднай хвіліны для свайго вызваленьня.

Я. Ч.

## ТРЫ ГАДЫ ПАД ДАЖДЖОМ І СЬНЕГАМ

### ПРАПАДАЮЦЬ ЗВЫШ 1000 ПЛУГОЎ.

### ВІНАВАТЫХ—ДА АДКАЗНАСЬЦІ!

На тэрыторыі складаў гарадзкое станцыі МБВ чыг., пад адкрытым небам, занесеныя сьнегам і птушыным памётам, ляжаць заржавеўшыя звыш тысячы штук плугоў.

Рабочыя-чыгуначнікі ўжо даўно зьвярнулі ўвагу на гэтае недапушчальнае ненармальнае зьявішча і давялі аб гэтым факце да ведама рэдакцыю «Зьвязды».

Камандыраваны па месца супрацоўнік нашае газэты для абсьледваньня гэтага факту і выяўленьня падрабязнасьцяй, знайшоў, што заява рабочых адпавядае сапраўднасьці.

Перад ім прадставілася наступная карціна. На дварэ чыгуначных складаў раскіданы ў розных мясцох асобныя плугі. Па некаторых мясцох гэтага вялізарнага двара з-пад сьнегу відаць толькі ручкі і асобныя часткі плугоў. Як тыя плугі, што відны, так і жалезныя часткі тых плугоў, якія відаць з-пад сьнегу, зусім заржавелыя. Акрамя таго, гэтыя сельска-гаспадарчыя прылады пакрыты сьмяцьцём. Ня можа быць ніякага пытаньня ў тым, што ў гэткім выглядзе плугі ня знойдуць пакупца і ёсьць вялікае сумненьне, ці наогул яны ўжо будуць прыгодны для продажу.

З вялікімі труднасьцямі наш супрацоўнік даведаўся аб тым, што гаспадаром гэтых безгаспадарчых плугоў зьяўляецца Белсельсаюз, куды ён і зьвярнуўся за тлумачэньнямі.

На запытаньне нашага супрацоўніка, старшыня праўленьня Белсельсаюзу т. Аксючыц адказаў, што гэтыя плугі ён пераняў у спадчыну ад старога праўленьня і што ён ведае аб тым, у якім становішчы яны знаходзяцца зараз. Пры гэтым т. Аксючыц заўважыў, што ён нічым дапамагчы справе ня мог, бо Белсельсаюз ня мае складачных памяшканьняў.

У бухгальтэрыі Белсельсаюзу супрацоўніку «Зьвязды» ўдалося выявіць, што гэта за плугі і колькі часу, як яны знаходзяцца ў такім безгаспадарчым становішчы. Плугі паступілі **30-га красавіка 1925 году** з заводу Белдзяржмэтрам (Віцебск). Частка з гэтай партыі прадана, а 1.527 плугоў засталося яшчэ на 1-га кастрычніка 1926 г. непраданымі. Дасканала высьвятліць, колькі плугоў знаходзіцца зараз на дварэ чыгуначнага складу ў Белсельсаю е, не ўдалося. Паводле слоў вартаўніка складу, пад сьнегам знаходзіцца звыш 1.000 плугоў. Між іншым, на тэрыторыі чыгункі, і яшчэ ў двух мясцох раскіданы іншыя сельска-гаспадарчыя прылады і машыны. Яны знаходзяцца ў некалькі лепшым становішчы, але ахова іх ад уплыву вады, сьнегу і паветра бязумоўна не давальняючая.

Цікава адзначыць, што зараз, пасьля таго, як аб гэтым даведалася савецкая грамадзкасьць, Белсельсаюз зьбіраецца назначыць таргі на арэнду складаў, каб туды перавесьці ўсю сваю безгаспадарчую маемасьць.

Такім чынам, калі трох год Белсельсаюз не зварочваў належнае ўвагі тэй справе, якою ён непасрэдна займаецца. **Замест таго, каб прасоўваць сельска-гаспадарчыя машыны і прылады ў гушчу сялянства, ён марыне іх на бяспрытульным складзе пад адкрытым небам, даводзячы іх да такога становішча, калі ніводзін селянін у гэткім выглядзе, бязумоўна, не захоча іх купіць. Калі нават адраманта ваць усе гэтыя безгаспадарчыя заржавелыя плугі, на што павінна пайсьці не адна тысяча народных рублёў, то дзе-ж упэўненасьць, што селянін, закупіўшы такі плуг, ня будзе праклінаць потым і савецкі завод, і савецкую каапэрацыю і савецкую ўладу.**

Мы патрабуем тэрміновага ўмяшацельства ў гэту справу органаў РСІ і пракуратуры. Мы патрабуем падрабязнага расьсьледваньня і выяўленьня вінаватых. Мы патрабуем суровай кары для тых, хто вінаваты ў растраце народнай маемасьці, у кампрамэнтацыі савецкай улады, яе ўстаноў і савецкай грамадзкасьці—сельска-гаспадарчай каапэрацыі.

## БАРАЦЬБА У КІТАІ.

### Рэвалюцыйнае войска змагаецца пад Кантонам.

ШАНХАЙ, 11. Як паведамляюць газэты, у ваколіцах Кантону ня спыняецца дзейнасьць кітайскага рэвалюцыйнага войска, якое змагаецца пры дапамозе сялянскіх атрадаў.

У Ханькоу ня спыняюцца арышты. Як паведамляюць газэты, на гэтых днёх арыштавана некалькі сот партовых рабочых і 20 радыкальных лідэраў, у якіх нібы знойдзена бальшэвіцкая літаратура.

Навоўле вестак з Ханькоу, у турмах Учану, Ханьяну і Ханькоу знаходзіцца 500 камуністых і левых дзеячоў рабочага руху, якія будуць адданы пад суд.

## Сацыял-здраднікі баяцца ангельскае кампартыі.

ЛЕНДАН, 7. Выканком ангельскай рабочай партыі ня спыняе кампаніі супроць камуністых. У апошні час выканком разаслаў усім мясцовым аддзяленьням рабочай партыі рад «дакумантаў» разам з лістом, у якім выказваецца надзея, што гэтыя дакументы дапамогуць „лайяльным" членам рабочай партыі „змагацца на мясцох з дзейнасьцю разбуральных элементаў".

Гэтыя дакументы складаюцца—з копіі статуту і ўмоў уступленьня ў Камуністычны Інтэрнацыянал і двух мэмарандумаў: аднаго па пытаньні аб Лізе барацьбы супроць імпэрыялізму і калёніяльнага ўціску і другога —на пытаньні аб дзейнасьці МОПР-у.

## Сакратар генрады за „мір" у прамысловасьці.

ЛЁНДАН, 6. Сакратар генрады кангрэсу ангельскіх прафсаюзаў Сітрын выступіў на сходзе асацыяцыі супрацоўніцтва ў прамысловасьці (пропагандыстская арганізацыя прадпрымальнікаў) па пытаньні аб адносінах прафсаюзаў да ідэі супрацоўніцтва ў прамысловасьці. Два гады тому назад Сітрын выступаў на сходзе той-жа арганізацыі і заявіў, што прафсаюзы адносяцца да ідэі супрацоўніцтва ў прамысловасьці падазронна, а ў ва многіх выпадках і адкрыта варожа.

Цяпер-жа Сітрын заявіў, што «сучасны момант зьяўляецца найбольш адпаведным да дакладнага і бесстароннягa разгляду пытаньня аб магчымасьці супрацоўніцтва».

## Па Савецкім Саюзе.

### Пераход на 7-гадзінны дзень.

#### Павялічэньне зарплаты і зьніжэньне сабекошту. —3.000 новых рабочых удзягваюцца ў вытворчасьць.

УЛАДЗІМІР, 10. З 15-га лютага працаздольна-ткацкая фабрыка імя Абальмана, адна з буйнейшых тэкстыльных фабрык губэрні, пераходзіць на 7-гадзінны працоўны дзень. Уводзіцца трэцяя зьмена і ўплатнецца працоўны дзень. 194 ткачыхі пераводзяцца на работу па чатырох варштатах, усе іншыя будуць працаваць на трохках. У працаздольным адзеле ватэрштчыцы пераходзяць з аднэй і двух старонак на тры і чатыры. Пушчаныя ў работу чатыры пробных чацьвёркі паказалі, што ткачыхі добра спраўляюцца з работаю на чатырох варштатах.

У зьвязку з гэтым пераходам, заработная плата значна павышаецца. Пры рабоце на чатырох варштатах зарплата ткачых павялічваецца на 64 проц. у параўнаньні з работаю на парах.

На ватрах пры рабоце на чатырох старонках павялічэньне зарплаты будзе складаць 56 проц. У выніку пераходу на 7-гадзінны працоўны дзень дасягаецца агульнае зьніжэньне выдаткаў і сабекошту.

Рабочыя вітаюць пераход на скарочаны і ўшчыльнены працоўны дзень. На фабрыцы падана звыш 60 заяў ад ткачых аб добраахвотным пераходзе на чацьвёркі. Некаторыя работніцы падалі заявы аб іх жаданьні перайсьці на абслугоўваньне часьці варштатаў.

* *

ІВАНАВА-ВАЗЬНЯСЕНК, 11. Нарада прадстаўнікоў трэстаў і саюзу тэкстыльшчыкаў, акрамя фабрык Раднікоўскай, Вялікай Шуйскай і Серэцкай, пастанавіла перавесьці з 16-га студзеня на 3-х зьменную працу і 7-гадзінны працоўны дзень таксама і новую прадпрыемную фабрыку імя Дзяржынскага. Работа на гэтых фабрыках будзе ісьці з 4 гадзін раніцы да 1-й гадз. ночы. Пераход фабрык на 3-х-зьменную працу патрабуе найму 3000 новых рабочых. На гэтых днёх спяваюцца рабочых канферэнцыі, для абмяркаваньня ўсіх бакоў пытаньня аб пераходзе фабрык на новыя ўмовы працы.

### Яшчэ 6 фабрык—на 7-гадзінны рабочы дзень.

**МАСКВА, 12. Наркампрацы СССР т. Шмідт у гутарцы з нашым супрацоўнікам заявіў:**

**—У дадатак да пастановы ўрадавай камісіі ад 6-га студзеня аб пераводзе на 7-гадзінны рабочы дзень 14 баваўняных фабрык, на гэтым пасяджэньні пастаноўлена перавесьці на 7-гадзінны рабочы дзень яшчэ дзьве баваўняныя фабрыкі— фабрыку «Рабочы», трэст „Пёстратканьё" і фабрыку імя Сьвярдлова, уладзімірскага трэсту. Апроч таго, камісія пастанавіла перавесьці на 7-гадзінны рабочы дзень чатыры суконныя фабрыкі.**

**Суконныя фабрыкі павінны быць пераведзены на 7-гадзінны рабочы дзень не пазьней 23 студзеня.**

## Хлебазагатоўкі.

### Арышт прыватных гандляроў за спэкуляцыю.

ЗАПАРОЖЖА, 12. За арыў хлебазагатовак і перавышаньне канвэнцыйных цэн ДПУ арыштавана 11 спэкулянтаў хлебам.

* * *

МАРЫУПАЛЬ, 12. ДПУ арыштавана група прыватнікаў, якія зрывалі хлебазагатоўкі і скуплялі збожжа ў сяла па павышаных цэнах.

### Прэміраваньне спажывецкіх таварыстваў.

ДНЕПРАПЯТРОЎСК, 12. Праўленьнем спажывецкага саюзу прэміравана 23 супрацоўнікі сельскіх спажывецкіх таварыстваў за пасьпяховае правядзеньне хлебазагатоўчай работы.

### За злосную няўплату падаткаў.

КІЕЎ, 12. За апошні час у Кіеўскай акрузе выяўлен рад выпадкаў злоснага ўхілу ад ўнёсу сельска-гаспадарчага падатку. Па распараджэньні кіеўскага пракурора злосныя неплацельшчыкі прыцягваюцца ў тэрміновым парадку да крымінальнай адказнасьці.

Узбуджаны таксама судовыя справы супроць некалькіх старшынь сельсаветаў за бяздзейнічаньне ў справе спагнаньня сельска-гаспадарчага падатку.

Працяг тэлеграм на 2-й стар

## НАЧНОЕ РАДЫЕ

(Атрымана а 1-ай гадзіне ночы).

### Да польска-літоўскіх перамоў.

**ВАРШАВА, 12. Польскі ўрад паслаў у Коўну праз спэцыяльнага курэра ноту, у якой прапануе пачаць польска-літоўскія перамовы ў канцы студзеня ў Рызе. Нота намячае асновы для перамоў, якія павінны пачацца з абгавору пытаньняў аб руху ў раёне польска-літоўскае граніцы, аб транзіце, аб паштовых, тэлеграфных і чыгуначных зносінах.**

### За супрацоўніцтва з студэнцкімі арганізацыямі СССР.

**ВЕНА, 12. На канфэрэнцыях міжнароднае студэнцкае фэдэрацыі ў Любляне (

# ПА САВЕЦКІМ САЮЗЕ.

## АДЗІНЫ ФРОНТ ЗЬНІЗУ.

### Да надыходзячага чацьвертага кангрэсу Прафінтэрну.

МАСКВА, 10. 15-га сакавіка адчыняецца сусьветны чацьверты кангрэс Прафінтэрну. Абмяркоўваючы задачы кангрэсу, генэральны сакратар Прафінтэрну тав. Лазоўскі сказаў:

— Кангрэсу прыдзецца разглядзець ва ўсёй паўнаце і складанасьці пытаньні далейшае барацьбы за адзінства. Адзіны фронт павінен быць ажыцьцёўлены ня зьверху, а зьнізу. Далей, адным з важнейшых пытаньняў на кангрэсе будзе пытаньне аб барацьбе супроць імпэрыялізму і насоўваньня вайны. Як і папярэднія кангрэсы, чацьверты кангрэс аддасьць шмат увагі рабочаму руху калёніяльных і паўкалёніяльных краін, асабліва задачам кітайскіх прафсаюзаў і кітайскай рэвалюцыі. На кангрэсе пытаньне аб тактыцы прыхільнікаў Прафінтэрну ў Англіі стаіць паасобным пунктам у парадку дня, бо Англія ўяўляе сабою важнейшую капіталістычную эўрапейскую дзяржаву і нарастаючыя ў ёй сацыяльныя канфлікты маюць вялізнае значэньне для ўсяго сусьветнага рабочага руху.

Трэба таксама выпрацаваць сур'ёзную праграму барацьбы за сацыяльнае закападаўства. Апошнія гады характарызуюцца адабраньнем цэлага раду элемэнтарных заваёў рабочых; 8-гадзінны працоўны дзень у шмат якіх краінах існуе толькі на паперы. Між тым, чацьвертаму кангрэсу Прафінтэрну бязумоўна прыдзецца ўжо высунуць у якасьці лёзунгу барацьбу за 7-гадзінны працоўны дзень.

## Пабудова газэтнае фабрыкі ў Харкаве.

ХАРКАЎ, 10. Увесну бягучага году ў Харкаве пачнецца пабудова буйнейшай друкарні, у якой мяркуецца сканцентраваць друкаваньне ўсіх газэт і часопісаў, што выдаюцца ў Харкаве.

Каб уявіць сабе моцнасьць гэтае друкарні, трэба зазначыць, што тыраж газэт, якія друкуюцца ва ўсіх харкаўскіх друкарнях, складае, прыкладна, 10 мільёнаў адбіткаў.

Друкарня будзе абсталёвана па апошнім слове тэхнікі. У прыватнасьці, маюць быць устаноўлены ў друкарні для друкаваньня часопісаў машыны, якія даюць высокамастацкі друк па спосабу мецца-цінто.

Абсталяваньне друкарні будзе каштаваць звыш 1,4 мільён. руб.

Друкаваньне ў новай друкарні будзе значна танейшым. Калі зараз кошт тысячы знакаў машыннага набору ў харкаўскіх паліграфічных прадпрыемствах вагаецца ад 78 к. да 1 р. 39 к., дык у новай друкарні машыны набор такое-ж колькасьці знакаў будзе каштаваць ня больш 57 к.

## Латвія бяз ураду.

РЫГА, 11. У Латвіі лагэтуль яшчэ ня створан урад. Усе спробы буржуазных партый закуль што скончыліся няўдачаю. Апошняя спроба дэмакратычнага цэнтру стварыць правы габінэт таксама ноўдалася.

## Прэзыдэнт Рэляндэр і барон Грэвеніц

У працягу апошняга году, г. зн. у той час, калі ўлада ў Фінляндыі была ў руках меншавікоў, дзейнасьць расійскіх белагвардзейцаў у гэтай краіне прыняла асабліва інтэнсыўны характар.

Можна сьцьвярджаць, што зарубежная белагвардзейшчына лепшых сваіх „малайцоў" накіроўвала іменна ў Фінляндыю, як у краіну, дзе гэтыя малайцы карысталіся (і карыстаюцца) добрым прытулкам, ня гнедзячы на іх злачынную работу супроць СССР. Тэрарыстычныя акты, зробленыя белагвардзейцамі на нашай тэрыторыі ў мінулым годзе, натхняліся галоўным чынам з Фінляндыі, дзе яны мелі сваю матар'яльную і „ідэалёгічную" базу.

Аб гэтым яскрава сьведчаць паказаньні былога царскага афіцэра гвардыі Эльвэнгрэна, а таксама і тыя вядомыя шпіёнска-тэрарыстычныя судовыя працэсы, якія ня так даўно адбыліся ў Ленінградзе.

Калі савецкі ўрад зьвярнуўся да Фінляндыі з пратэстам супроць прадастаўленьня прытулку белагвардзейшчыне на яе тэрыторыі, падмацаваўшы пры гэтым неабяржымым фактам „дзярсыйную" работу белагвардзейскіх наймітоў ангельскага імпэрыялізму, сацыялдэмакратычны ўрад Фінляндыі пасьпяшыўся адказаць, што ён ужыве рашучыя меры для зьнішчэньня гэтага зла.

Якія іменна „рашучыя меры" ўжыў фінляндзкі ўрад у гэтым напраму—відаць з перапіскі паміж белагвардзейскімі „дыплёматамі" Гірсам і баронам Грэвеніцам, агалошанай у газэце „Правда"

Аказваецца, што фінляндзкі прэзыдэнт Рэляндэр прыняў прадстаўніка Мікалая Мікалаевіча Раманава—барона Грэвеніца і доўга з ім гутарыў аб „будучай Расіі".

Які, аднак, узрушаючы малюнак: прэзыдэнт рэспублікі, які, згодна устаноўленых міжнародных дыплёматычных звычаяў, толькі ў выключным выпадку прымае чужаземнага пасланьніка (звычайна чужаземны пасланьнік зварачаецца да міністра замежных спраў), у даным выпадку прымае белагвардзейскага „дыплёмата" і гутарыць з ім на тэму аб тым,—як будзе адносіцца „будучая Расія" да незалежнасьці Фінляндыі.

Што і казаць,—ці-ж гэта не „рашучыя меры" супроць белагвардзейскіх тэрарыстых...

Паважаны барон Грэвеніц сьпяшаецца, зразумела, упэўніць свайго высокапастаўленага прыяцеля, што „будучая Расія" будзе паважаць сувэрэнітэт Фінляндыі, бо яна (Фінляндыя)—не якая-небудзь Эстонія або Латвія, якія, згодна высокай думкі барона, „пажадаюць па ўласным пачыне далучыцца да будучай Расіі".

Тут у дужках трэба адзначыць—ці не таму ўжо барон Грэвеніц ганебна адносіцца да Эстоніі і Латвіі і прадракае ім „далучэньне", што ён, будучы, відавочна, прыбальтыцкім баронам, меў там у даўнія часы сотні дзьве-тры дзесяцін зямлі з рознымі будынкамі.

Хто-ж ня ведае, якую ролю адыгрывалі ў Прыбальтыцы бароны ў стары царскі час. Карныя экспэдыцыі, на чале якіх звычайна стаялі самі-ж бароны-памешчыкі, сотнямі зьнішчалі непакорных сялян, а многія тысячы, не выключаючы жанчын і падростку, жорстка караліся. Баронскі бізун быў у той час у прыбальтыцкім краі вышэйшаю формаю дзяржаўнае ўлады.

Аднак, цяпер барон Грэвеніц—ня зусім барон, праўдзівей—барон „па паходжаньні", але не па ўладзе. Таму вось ён, гутарачы з фінляндзкім прэзыдэнтам Рэляндэрам, бярэ мінорны тон і „міласьліва дарує" Фінляндыі незалежнасьць, цьвёрда ведаючы, што сваім „шляхэтным гэстам" ён вымаўляе ў прэзыдэнта права прытулку для сваіх малайцоў. Напрыклад, белагвардзеец Ларыёнаў, які, паводле слоў барона Грэвеніца, „кінуў бомбы ў камуністычным клюбе ў Ленінградзе", высылаецца з Гэльсінгфорсу ў Данцыг, але яму тут-жа выдаецца віза назад, і ён праз некалькі дзён варочаецца ў Гэльсінгфорс. Гэта інсцэніроўка высылкі белагвардзейскага тэрарыстага зроблена дзеля таго, каб „міністэрства замежных спраў магло паведаміць прадстаўніцтву СССР аб тым, што Ларыёнаў выслан з краіны".

Тут трэба ў заключэньне адзначыць, што блізарукая палітыка „дзяржаўных мужоў" Прыбальтыкі, —палітыка заахвочваньня варожых выпадаў белагвардзейскіх банд супроць СССР—ня толькі не адпавядае жыцьцёвым інтарэсам народаў гэтых краін, але наадварот,—мае вялікія ўскладненьні, якія яўна інсьпіруюцца ангельскім кансэрватыўным урадам з мэтаю стварэньня варожага кола вакол Савецкага Саюзу.

Язэп Салянка.

# ЖЫЦЬЦЁ ПАРТЫІ

## 15-ты партзьезд—аб асновным у нашай гаспадарцы.

Галоўная труднасьць у гаспадарцы СССР гэта—нядосыць развітая прамысловасьць: не хапае мэталю, мала машын, хэмічных угнаеньняў; лён падрыхтоўваецца сялянкамі ў цяжкай працы, таму што няма ільнотрапальных заводаў, адчуваецца недахват сукна, паркалю, абутку ды ці мала яшчэ чаго іншага.

15-ты партзьезд, адзначаючы ўсё гэта, пацьвердзіў правільнасьць партыйнай лініі на індустрыялізацыю краіны і даў паказаньні плянавым органам выпрацаваць 5-гадовы плян з разьлікам пасьлядоўнай індустрыялізацыі краіны.

Гэта значыць — мы павінны ствараць новыя вытворчасьці, у адносінах да якіх СССР у значнай ступені залежыць ад заграніцы, разгарнуць агульнае машынабудаваньне, будаўніцтва трактараў, самалётаў, аўтамабіляў, суднаў, каляровую і чорную мэталюргію (выпрацоўку чыгуну, жалеза, медзі, волава, цынку і г. д.), сельска-гаспадарчае машынабудаваньне, хэмічную вытворчасьць і г. д. Мы павінны разгортваць як мага больш энэргічна пасевы бавоўны, ільну, канопель, цукровых буракоў, масьляных расьлін, бульбы, пшаніцы, разьвіваць аўцаводзтва, будаваць заводы па пераапрацоўцы сельска-гаспадарчых прадуктаў (баваўнянаачысьніцельныя, ільнатрапальныя, маслабойныя, бульбацёрачныя, кансэрвныя і інш.).

Пры гэтым індустрыялізацыя краіны павінна адбывацца з такім разьлікам, каб сабекошт прамысловых вырабаў ва што-б та ні стала зьніжаўся. 15 партзьезд аб гэтым гаворыць так:

— Адпускныя цэны на прадукцыю прамысловасьці павінны сыстэматычна зьніжацца, забясьпечваючы пасьлядоўнае звужэньне раствору «ножніц», гэта значыць, зжываньня дыспрапорцыі цэн па прадукты прамысловасьці—з аднаго боку, сельскай гаспадаркі—з другога і дыспрапорцыяй паміж узроўнем нашых цэн і цэн сусьветнага рынку. «Ажыцьцяўленьне гэтых задач магчыма толькі пры ўмове рашучага зьніжэньня сабекошту».

Праводзячы індустрыялізацыю СССР, павялічваючы, палепшваючы і робячы танейшаю вытворчасьць, мы будзем узьнімаць дзяржаўную прамысловасьць на такую вышыню, што прыватная прамысловасьць ня зможа з ёю канкураваць. Рост-жа прамысловасьці вядзе і да росту каапэрацыі, бо насельніцтва больш ахвотна панясе свой пай у такую каапэрацыю, у якой і тавараў шмат, і якасьць іх ня дрэнная, і цэны нявысокія. З індустрыялізацыяй краіны, з ростам каапэрацыі прыватнік павінен будзе і ў далейшым згортвацца.

На аснове росту прамысловасьці, дзяржаўнага гандлю, каапэрацыі, 15-ы партзьезд дае дырэктыву яшчэ больш энэргічна націскаць на капіталістых у горадзе і ў вёсцы, зьмяншаючы іх драпежніцкія апэтыты.

У. С.

## Кастрычнікавы заклік у Бабруйшчыне.

На 1-е студзеня ў ячэйкі акруговай партарганізацыі паступіла 825 заяў ад рабочых і работніц аб прыёме іх у партыю. У партыю ўступаюць перадавыя сьвядомыя рабочыя, прайшоўшыя школу грамадзкай працы. З 332 чалавек, прынятых (канчаткова аформлены акругкомам) у кандыдаты, каля 70 проц. актыўна выконваюць работу ў парадку грамадзкай нагрузкі па наступных галінах: у саветах працуе 12 чалавек, каапэрацыі—6, у добраахвотных таварыствах—50, бяруць актыўны ўдзел у вытворчых нарадах і камісіях—48 чалавек, у жаночых дэлегацкіх сходах—9 ч. З агульнага ліку прынятых скончылі школу палітграматы 76 ч. (23 проц.). У складзе прынятых у кандыдаты ёсьць значная частка таварышоў, якія былі на франтох грамадзянскай вайны, актыўных удзельнікаў партызанскага руху ў часе акупацыі Беларусі немцамі і белапалякамі.

Жанчын у ліку прынятых у кандыдаты 6 проц., членаў КСМ—14 проц.

Рабочыя цэнзавых прадпрыемстваў складаюць 91 проц. і толькі 9 проц. налічваецца рабочых дробных саматужных прадпрыемстваў, рабочых-адзіночак і г. д. Каля 30 проц. складаюць высока-кваліфікаваныя рабочыя з вялікім вытворчым стажам (рабочыя чыгункі, дэпо і гуты).

Па вытворчым стажы прынятыя ў кандыдаты разьмяркоўваюцца наступным чынам: што працуюць на вытворчасьці каля 3 год—7 проц., ад 3 да 5 год—15 проц., ад 5 да 10 год—28 проц., ад 10 да 20 год—34 проц. і звыш 20 год—16 проц. Такім чынам мы бачым, што 50 проц. усіх прынятых складаюць рабочыя з вытворчым стажам звыш 10 год.

У буйныя прадпрыемствы на раёны (чыг. вузел Жлобін, гута «Акцябр») выяжджала в акругі прыёмачная камісія, якая праводзіла адкрытыя пасяджэньні па прыёме ў партыю ў прысутнасьці шматлюднага сходу ўсіх рабочых даных прадпрыемстваў. Гэта выклікала вялікі ўздым настрояў.

У выніку прыему ў партыю па кастрычнікавым закліку ў некаторых прадпрыемствах партыйнае ядро якое раней было нязначнае (7 проц.), павышаецца да 30—40 проц. У больш дробных прадпрыемствах яно павялічваецца з 20 да 75 проц.

В. Ціхаміраў.

## Будзем адкрыта гаварыць аб балячках партапаратаў.

Пытаньні рацыяналізацыі і ўпрашчэньня работы апаратаў займаюць у сучасны момант адно з важных месц у нашай практычнай штодзённай працы. Больш за ўсё ў гэтых пытаньнях гаворыцца аб апаратах савецкіх, каапэрацыйна-гандлёвых, прафсаюзных і інш., але рэдка дзе сустракаеш ці ў парадку абгаварэньня, ці выкрыцьця паасобных недахопаў пытаньне аб упрашчэньні работы партыйнага апарату, а тое, што апарат па партыйнай лініі патрабуе некаторага ўпрашчэньня, зьяўляецца пытаньнем відавочным.

Раней, чым прыступіць да прывядзеньня паасобных фактаў з практыкі партыйнае работы, трэба абумовіцца, што ўсе труднасьці гэтай работы прыпадаюць на нізавыя арганізацыі партыі: ячэйкі, райкомы, якім прыходзіцца ажыцьцяўляць дырэктывы вышэй стаячых парторганаў у сваёй практычнай працы. Тав. Касіёр у аргазізацыйнай справаздачы ЦК па XV партзьезьдзе сказаў: ...«у нашым кіраўніцтве надзвычайна шмат увагі аддаецца паперы. Мы вось у ЦК пішам рэзалюцыю, у губэрні яе перапісваюць, пасвойму перапісваюць і ў паветах, перапісваюць і ў валасьцях [illegible] ствараецца цэлая драбіна...» і далей заканчвае сваю думку тав. Касіёр—«нам трэба тут увесьці большы парадак у правядзеньні нашых дырэктыў, каб надарма ня траціць паперы і ня блытаць нашых партыйцаў».

Вялікая хваля паперы іншы раз залівае нашых нізавых працаўнікоў і ў выніку нізавы працаўнік, або адразу бярэцца за некалькі галін работы і ніводнай добра ня робіць, або пад цяжарам гэтай хвалі апускае рукі.

Пераходжу да фактаў. У парадку падрыхтоўкі пытаньня аб масавай працы да пленуму ЦК КП(б)Б у сакавіку 1927 г. па акругкомах быў разасланы абежнік з схэмаю пытаньняў, які вывучаў вопыт усёй масавай работы па акрузе. Схэма густа надрукаваных пытаньняў ледзь вымяшчалася на 10 старонках і гэты вялізарны матар'ял аб масавай працы па ўсіх галінах прапанавалася прадставіць на працягу 7 дзён (атрыманы матар'ял 5-га лютага 1927 г., тэрмін прадстаўленьня 12-га лютага), зразумела ў такі тэрмін выканаць гэта пры ўсім жаданьні нельга, у працілеглым выпадку матар'ял павінен атрымацца павярхоўны, нядосыць глыбока прапрацаваны, а для грунтоўнай прапрацоўкі Агітпропу АК патрэбавалася каля 4 месяцаў (працавалі пасьля сакавіковага пленуму).

Другі факт—гэта прысылка аналёгічнага матар'ялу аб падагуленьні прапрацоўкі пастаноў XV зьезду, праўда, па колькасьці старонак ён некалькі меншы (8 старонак), але па тым матар'яле, які патрабуецца, ён перавышае ўсе прасімыя раней зьвесткі.

Да агульнай зводкі аб выніках прапрацоўкі прапануецца даваць:

1. Пляны і абежнікі АК і РК аб прапрацоўцы. 2. Форму № 7 аб прапрацоўцы пастаноў у КСМ. 3. Плян прапрацоўкі сярод камсамолу. 4. Форму № 1 аб ходзе пленумаў і спрэчак у АК і РК. 5. Рэзалюцыі пленумаў АК і РК па дакладах аб выніках зьезду. 6. Зводку спрэчак і рэзалюцый па пленумах. 7. Форму № 2 аб характары сходаў актыву. 8. Зводку спрэчак на сходах актыву. 9. Рэзалюцыі сходаў актыву. 10. Зводкі запісак, паданых дакладчыкам на сходах актыву. 11. Форму № 3 аб колькасным складзе, аб характары агульных сходаў партыйцаў. 12. Зводку спрэчак на агульных сходах партыйцаў. 13. Зводку рэзалюцый на агульных сходах партыйцаў. 14. Зводку запісак на агульных сходах партыйцаў. 15. Форму № 4 аб актыўнасьці і характары ячэйкавых сходаў. 16. Зводку спрэчак на ячэйкавых сходах. 17. Зводку рэзалюцый на ячэйкавых сходах. 18. Зводкі запісак дакладчыкам на ячэйкавых сходах. 19. Форму № 5—характары і актыўнасьці камсамольскіх сходаў і пасяджэньняў. 20. Зводкі рэзалюцый па паасобных відах КСМ сходаў. 21. Зводкі запісак дакладчыкам па паасобных відах КСМ сходаў. 22. Форму № 6 па папулярызацыі пастаноў на беспартыйных сходах. 23. Зводкі характарных выступленьняў на беспартыйных сходах па тыпах. 24. Зводкі запісак па паасобных сходах беспартыйных. 25. Зводкі рэзалюцый па паасобных відах беспартыйных сходаў. 26. Рэзалюцыі аб выніках прапрацоўкі.

Няварта далей злоўжываць увагаю чытача. З паданага відаць, што гэты вынікавы матар'ял можна было-б сьмела скараціць па 80-85 проц., але таварыш, які складаў гэтыя пытаньні, напэўна забыў, што ў канчатковым выніку прыдзецца над гэтым матар'ялам працаваць нізавому ячэйкаваму і раённаму працаўніку, які акрамя такіх заданьняў яшчэ сім-тым заняты.

І трэці факт—гэта запытаньні па некалькіх лініях аднаго і таго-ж матар'ялу. Да перавыбараў кіруючага складу ячэек атрымліваецца запытаньне з аддзелу вучоту АК аб прадстаўленьні лічбавых даных, якія характарызуюць панова абраны склад ячэек і райкомаў—па сацыяльным становішчы, нацыянальнасьці, партстажы, родзе заняткаў і г. д., у інфармацыі АК па гэтым-жа пытаньні запрашваецца поўнае асьвятленьне ходу і падрыхтоўкі перавыбараў, а таксама лічбавы матар'ял аб панова абраным складзе па нацыянальнасьці, сацыяльным становішчы, партстажы, працы і г. д.

І па гэтых дзьвюх лініях аднолькавыя запытаньні ідуць да ячэйкі і па гэтых-жа лініях зьвяртаюцца да аўтара гэтага запытаньня. Аналёгічная роўналегласьць наглядаецца ў пытаньнях аб перавыбарах дэлегатаў, партасьвеце і г. д.

На старонках друку трэба выявіць гэтыя дробныя недахопы, якія загружаюць іншы раз залішняй работай нізавых працаўнікоў, і каму належыць, заняцца ўпрашчэньнем і рацыяналізацыяй работы партапарату.

Аронаў.

## Партыйная хроніка.

### 18 гурткоў самаадукацыі.

Па г. Менску зараз працуе 18 гурткоў па самаадукацыі, якімі абхоплена звыш 150 партыйцаў.

### 100 падпісчыкаў на «Завочны камвуз».

На „Завочны камвуз" падпісалася з партарганізацыі г. Менску 100 чалавек. Гэтымі днямі цэнтральны агітпрапгабінэт склікае нараду тых партыйцаў, якія займаюцца самаадукацыяй па „Камвузе на даму".

### Вытворчы куток пры агітпрапгабінэце.

Пры цэнтральным агітпрапгабінэце прыступлена да арганізацыі паказальнага вытворчага кутку. Кутком будуць абхоплены ўсе галіны партыйнай і грамадзкай працы на буйных прадпрыемствах.

### Сэмінары па партбудаўніцтве.

Цэнтральны агітпрапгабінэт у хуткім часе прыступае да арганізацыі сэмінара сакратароў ячэек па пытаньнях партыйнага будаўніцтва.

# II-ая СЭСІЯ ЦВК БССР.

## Бюджэт БССР на 1927-28 г.

## Даклад народнага камісара фінансаў тав. МІКУЛІЧА.

**Бюджэт на 1927-28 г. складае 63.147.000 руб.—Рост бюджэту—на 22,8 проц.—40 проц. сялянства будуць вызвалены ад сельгаспадатку.—На прамысловасьць вызначана 8.800.000 руб. —Лёзунг аб індустрыялізацыі краіны выконваецца.—На сельскую гаспадарку намячаецца сума ў 11 мільёнаў руб.—Адміністрацыйныя выдаткі скарачаюцца на 19,4 проц. — Папраўкі бюджэтнай камісіі.**

Дзяржаўны бюджэт БССР на 1927-28 год, паданы Саўнаркомам на зацьверджаньне сэсіі, складзен у суме 63.147.000 руб., што дае рост у параўнаньні з мінулым годам на 22,8 проц.

У прыбытковай частцы бюджэту пазіраюцца ў параўнаньні з бюджэтамі мінулых гадоў некаторыя асаблівасьці, якія заключаюцца ў тым, што пасьля нясупыннага і бурнага росту непадатковых прыбыткаў, апошнія ў бягучым годзе выказваюць некаторае зьніжэньне, галоўным чынам, за кошт зьніжэньня лясных прыбыткаў. Гэтае зьніжэньне лясных прыбыткаў зьявілася вынікам скарачэньня разьмеру і пагашэньня якасьці лясное плошчы, якая перадаецца ў зямельны фонд.

Аднак, непадатковыя прыбыткі захоўваюць у бюджэце пераважнае значэньне, складаючы 56,6 проц. усёй сумы ўласных прыбыткаў.

Аднэю з галоўнейшых прыбытковых крыніц, калі не па сваёй удзельнай вазе, дык па сваім эканамічным і палітычным значэньні, зьяўляецца сельска-гаспадарчы падатак, які закранае ўсе сялянскія масы. Сельгаспадатак на 1927-28 год складае 9.200.000 р., даючы рост супроць мінулага году на 8,3 проц. Але калі ўлічыць ільготы па Кастрычнікавым маніфэсьце, дык гэтыя лічбы павінны зьнізіцца на 600.000 руб. за кошт дадатковых палёгак для бяднейшай часткі сялянства. Тады мы будзем мець ня рост, а паніжэньне сумы сельгаспадатку супроць бюджэтных прызначэньняў мінулага году.

Калі сюды дадаць тыя палёгкі, якія прадстаўляюцца РВК'амі насельніцтву па стыхійных няшчасьцях за кошт скідачнага фонду, тады па нашых разьліках каля 40 проц. сялянскіх гаспадарак будуць [illegible] ад с.-г. падатку.

Складаючы в вялікай эканоміі і строгім адборам запатрабаваньняў выдаткавая частка дзяржбюджэту ў асноўным накірована на здавальненьне самых пільных патрэб беларускай народнай гаспадаркі. Выдаткі на народную гаспадарку павышаюцца ў параўнаньні з мінулым годам на 54 проц.

Што дае бюджэт беларускай прамысловасьці? На 1927-28 год асыгнаваньне па бюджэце на прамысловасьць вызначаецца ў суме 8.800.000 рублёў, што дае рост на 31,9 проц. Гэта сума пакрывае сабою асыгнаваньні трох папярэдніх гадоў. З гэтага можна зрабіць вывад аб тым, што лёзунг партыі аб індустрыялізацыі краіны памі выконваецца.

Акрамя сродкаў на прамысловае будаўніцтва, якія праходзяць па нашым бюджэце, выдзяляюцца асыгнаваньні Саюзнага ўраду на пабудову Асінаўскай электра-станцыі. Наш урад узяў на сябе абавязак удзельнічаць у разьмеры 30 проц. у будаўніцтве Асінстрою. Апроч таго, нашы мясцовыя гарадзкія электрастанцыі знаходзяцца ў такім становішчы, што яны патрабуюць пераабсталяваньня. Асыгнаваньні на электрыфікацыю ўзрастаюць супроць мінулага году на 24 проц., складаючы суму ў 1.400.000 руб.; туды ўваходзяць 400.000 руб. на пабудову Асінстрою і адзін мільён руб. па мясцовую электрыфікацыю.

На сельскую гаспадарку ўсяго намечана выдатковаць звыш 11 мільёнаў руб. (рост на 17 проц.). Акрамя сродкаў, што вызначаны па рэспубліканскім бюджэце БССР, прадугледжваюцца выдаткі па правядзеньне мэліярацыйных работ у суме 2.391.000 руб., якія падлягаюць адносьненьню на агульна-саюзны бюджэт.

Выдаткі на культурна-сацыяльныя патрэбы ўзрастаюць больш умераным тэмпам, чым выдаткі на народную гаспадарку. Так, каштарыс па ахове здароўя ўзрастае на 11,7 проц., па народнай асьвеце—на 10,3 проц., ня лічачы паўтара мільёны руб., што намечаны на пабудову ўчівэрсытэцкага гарадку.

Адначасова з павышэньнем выдаткаў на гаспадарчыя сацыяльна-культурныя патрэбы, адміністрацыйныя выдаткі дзяржаўных устаноў зьніжаюцца, у параўнаньні з мінулым годам, на 19,4 проц. Гэта сьведчыць аб праведзенай урадам БССР вялікай працы па рацыяналізацыі дзяржаўнага апарату. У выніку праведзенай рацыяналізатарскай работы па цэнтральным і акруговым апараце, скарочана 1.185 штатных адзінак ці 32 проц. агульнага штату, якія праходзілі па бюджэце па 1926-27 год.

Папярэднія цаны аб выкананьні дзяржаўнага бюджэту БССР за 1926-27 год паказваюць выкананьне прыбытковай часткі дзяржбюджэту ў разьмеры 99 проц. і выдатковай часткі—на 101 проц. Гэтыя лічбы сьведчаць аб рэальнасьці бюджэту мінулага году і ствараюць упэўненасьць ў рэальнасьці складаньня бюджэту.

З сакладам выступіў народны камісар РСІ—ЦВК, старшыня бюджэтнай камісіі ЦВК тав. Калінін, які ў заключэньне ад імя бюджэтнай камісіі ўнёс рад прапаноў аб неабходных дапаўненьнях і зьменах у паданы СНК бюджэт, якія, аднак у аснэўным не зьмяняюць агульнага малюнку бюджэту.

Сэсія зацьвердзіла паданы СНК бюджэт з тымі зьменамі, якія ўнесены бюджэтнай камісіяй. Канчатковае рэдагаваньне бюджэту даручана бюджэтнай камісіі.

## Пастаўленьне сэсіі аб сыстэме народнай асьветы.

Пасьля доўгіх і жвавых спрэчак аб сыстэме народнай асьветы, якія адбываліся на працягу трох пасяджэньняў, і заключнае прамовы прадстаўніка УССР тав. Раппо і дакладчыка тав. Баліцкага, сэсія пастанавіла перадаць праект народнага камісарыяту асьветы на абгаварэньне шырокіх колаў рабочых, сялян і культурна-асьветных працаўнікоў, узяўшы пад увагу існуючыя сыстэмы ў іншых Саюзных Рэспубліках.

Сэсія пастанавіла праект сыстэмы народнай асьветы паставіць на канчатковае зацьвярджэньне бліжэйшай сэсіі ЦВК БССР.

# Аб партыйцах-падпольшчыках.

ЦКК КП(б)Б праведзена абсьледваньне з мэтай дасканалага выяўленьня скарыстаньня членаў партыі-падпольшчыкаў у КП(б)Б. Гэтае пытаньне мае вялікую значнасьць ва ўнутрыпартыйнай дзейнасьці арганізацыі, бо падпольшчыкі—гэта ёсьць найбольш каштоўная частка партыі, якая выхоўвалася ў непасрэдных бойках з капіталізмам і мае вялікі вопыт барацьбы бальшавіцкай партыі за пралетарскую рэвалюцыю.

Пры гэтым трэба памятаць, што праслойка старых дарэвалюцыйных бальшавікоў засталася надзвычайна тонкаю, аб чым сьведчаць наступныя лічбы. Ва ўсёй УсеКП(б) членаў партыі-падпольшчыкаў налічваецца 10.758 або 1,4 проц. ад усёй лічбы членаў партыі. У КП(б)Б падпольшчыкаў—118 або 0,6 процантаў усяе партарганізацыі.

Такім чынам, калі ва ўсёй партыі процант падпольшчыкаў невялікі, то ў КП(б)Б ён яшчэ больш ня значны. Таму ў нас асабліва павінна быць зьвернута ўвага ўсёй партыі на яго захаваньне. Гэту мэту і мела на ўвазе ЦКК, калі ў выніках абсьледваньня прымала нэраг пастаноў па пытаньнях больш правільнага скарыстаньня на працы членаў партыі-падпольшчыкаў.

У дакладзе XI зьезду КП(б)Б тав. Кнорын падкрэсьліў важнасьць гэтага пытаньня. Ён паставіў перад зьездам пытаньне—«ці выкарыстаны ў належнай меры ўсе гэтыя старыя кадры, ці ўцягнуты яны ў актыўную працу?» І абсьледваньне ЦКК дае на гэтае пытаньне вычэрпваючы адказ.

Перш за ўсё, некаторыя лічбы аб складзе падпольшчыкаў. З 118 падпольшчыкаў: рабочых—107 ці ў адносінах да ліку ўсёй КП(б)Б—0,4 проц. і ў адносінах да ліку рабочых—0,8 проц.; служачых—9, сялян—2. З ліку 107 рабочых са стажам да 1905 г.—32 ці 29,8 проц., з 1905-13 г.—48 ці 46,6 проц., 1914-16 г.—27 ці 26,1 проц. Па ўзросьце найбольшая частка падае на падпольшчыкаў да 40 гадоў—іх 59 чал. ці 55,1 процантаў, ад 40 да 60 г.—44 ці 39,2 проц., звыш 60 гадоў—4 ці 3,7 проц. Па нацыянальнасьці больш за ўсё падпольшчыкаў латышоў і палякаў: латышоў—37, палякаў—33; менш расійцаў—11, яўрэяў—10, літвінаў—6. Рэшта прыпадае на другія нацыянальнасьці.

Больш за ўсё падпольшчыкаў у Менскай арганізацыі—51 таварыш, або 43 проц. усіх падпольшчыкаў. Далей ідуць іншыя арганізацыі, напрыклад — Віцебская—22 т. Гомельская—15 т.

Уплыў падпольшчыкаў на партыйную, камсамольскую і беспартыйную масу адчуваецца ўсюды, паколькі гэтаму не перашкаджае слабая палітычная падрыхтоўка і стан здароўя паасобных падпольшчыкаў. Большая частка падпольшчыкаў (61 ч. ці 51,7 процантаў) абраны ў парторганы. Так, у органах КК—23 таварышы ці 19,4 проц., у ЦКК—12, у АКК—13, у акругкомах і гаррайкомах—18, у сельскіх райкомах—8.

Даныя аб рабоце, якая выконваецца падпольшчыкамі, паказваюць, што з 107 таварышоў — 70 чал. ці 65,4 проц. знаходзяцца на адказнай працы, з іх: на партрабоце—21 ці 30 проц., на савецка-адміністрацыйнай працы—33 ці 43,1 проц., на прафпрацы—6 ці 8,8 проц. Апрача таго на каапэрацыйнай працы—3. На працы цэнтральнага маштабу знаходзіцца—28, акруговага—31 і раённага—11 чал.

Сярод радавых—з агульнага ліку 37—працуюць на розных прадпрыемствах і фабрыках—11 чал., у гаспадарчых органах—5, на розным тэхнічнай працы—15, на працы ў вёсцы—6 чал.

Непрацаздольных сярод падпольшчыкаў ва ўсёй КП(б)Б—4, інвалідаў—2, беспрацоўных—5.

Высоўваньне падпольшчыкаў адбываецца ў агульным парадку. Аднак, падлік выкарыстаньня працы падпольшчыкаў не наладжаны.

Пры агульным правільным выкарыстаньні падпольшчыкаў наглядаюцца некаторыя выпадкі ня матазгоднага выкарыстаньня, большай часткаю з прычын нявысокага агульнага разьвіцьця таварышоў.

Аднак, побач з гэтым ёсьць выпадкі няправільнага выкарыстаньня на працы падпольшчыкаў. Так, у Магілеўскай арганізацыі адзін таварыш, палітычна добра разьвіты, працуе старшым конюхам. У Менскай арганізацыі член партыі з 1913 г., па прафэсіі красільшчык, з 1919 г. па 1922 г. служыў палітработнікам Чырвонай арміі, цяпер выконвае фізычную працу, якая яму не па сіле.

Матар'яльнае становішча падпольшчыкаў у паасобных выпадках патрабуе большай увагі з боку парткомаў. Паасобныя падпольшчыкі залуляюць, што іх невыстарчальна скарыстоўваюць (рабочыя каля варштату) на партыйнай працы.

У сваіх прапановах ЦКК лічыць, перш за ўсё, неабходным адхіліць паасобныя выпадкі беспрацоўя, якія ёсьць сярод падпольшчыкаў (у Менскай, Магілеўскай, Аршанскай арг.); устанавіць больш чулыя адносіны да матар'яльных і кватэрных патрэб падпольшчыкаў, шляхам аказаньня ім дапамогі і падтрыманьня. Мэдыцынскія камісіі ў сваёй рабоце па аказаньні лекавай дапамогі павінны перш за ўсё памятаць аб дапамозе падпольшчыкам, асабліва радавым. У выпадках выяўленьня новых груп падпольшчыкаў, страціўшых працаздольнасьць—АК праз ЦК павінны падняць пытаньне аб павялічэньні колькасьці пэрсанальных пэнсій для падпольшчыкаў.

Павінна быць узмоцнена ўвага парткамітэтаў і ячэек да падпольшчыкаў-партыйцаў у сэнсе большага ўцягваньня іх у партыйную і грамадзкую працу, наглядаючы за правільным высоўваньнем у гэтай галіне падпольшчыкаў, а асабліва рабочых на прадпрыемстве. Неабходна як мага больш прывабліваць падпольшчыкаў да працы ў парткамітэтах, на сходах актыву, знаёміць з парт. матар'ялам—дакумантамі, дапамагаць у палітпадрыхтоўцы і вучобе, улічваючы жаданьні і бытавыя ўмовы.

Прапанована прыняць меры да больш поўнага прыцягненьня падпольшчыкаў іншых нацыянальнасьцяй да працы сярод нац. меншасьцяй, да якіх яны прыналежаць, у асаблівасьці дрэнна ўладаючых беларускай і расійскай мовай.

Для разьвязаньня пытаньняў, зьвязаных з выкананьнем даных прапазыцый, ЦКК прызнала неабходным штогодна правяраць іх выкананьне і пераглядаць правільнасьць выкарыстаньня падпольшчыкаў.

Выкананьне гэтых прапазыцый, бязумоўна, павінна будзе садзейнічаць задачы паўхоўваньня і правільнага скарыстаньня на працы падпольшчыкаў у КП(б) Беларусі.

А. Вінаградаў.

# ПЕРАВЫБАРЫ ў КААПЭРАЦЫІ

## Усе 100% пайшчыкаў.

### удзельнічалі ў перавыбарах.

### (Дрожджа-завод „Пралетары", Менск).

Улічваючы практыку мінулых год, заўком і ўпоўнаважаны ўжылі ўсе меры да таго, каб прыцягнуць на сход як можна больш пайшчыкаў МЦРК. Былі нават разасланы пэрсанальныя абвесткі кожнаму пайшчыку. Гэта дало станоўчы вынік. Прыйшлі ўсе 100 проц. пайшчыкаў. Раней бывалі выпадкі, што рабочыя спалі на сходах, на гэты раз было вельмі шумна.

З справаздачай выступіў т. Гравіт.

У спрэчках па дакладу рабочыя спыніліся на недахопе тавараў—сукна, матар'ялу на білізну, круп, масла, на перабоях у забесьпячэньні насельніцтва акраін газай. Адзначаны таксама і дасягненьні МЦРК

# Два мільёны рублёў

## на паляпшэньне сельгаспадаркі БССР.

## Чым карысна новая пазыка?

**90 мільёнаў—на сельскую гаспадарку.—21 мільён—на выйгрышы.—18 мільёнаў—прыбытак па купонах.**

Першая надзвычайна важная карысьць пазыкі для сялян заключаецца ў тым, што з агульнай сумы пазыкі ў 100 мільёнаў рублёў, 90 мільёнаў будзе цалком скарыстана на здавальненьне запатрабаваньняў сельскай гаспадаркі.

Важнейшая задача — узьняць ураджайнасьць сельскай гаспадаркі. Пры нашай вялізнай зямельнай плошчы павялічэньне ўраджаю в дзесяціны хоць-бы на 5-10 пудоў будзе мяць вялікае значэньне для ўсёй народнай гаспадаркі.

Для павялічэньня водпуску сродкаў на гэтыя мэты і выпушчана пазыка.

Як-жа будуць выкарыстаны грошы, якія будуць атрыманы ад продажу гэтае пазыкі? Савецкі ўрад мае намер выдаць іх на мерапрыемствы па барацьбе з сушаю, на перасяленчую справу, на забесьпячэньне сялян сельска-гаспадарчымі машынамі, рабочым быдлам, танным гатунковым насеньнем, на мэліярацыйныя работы. Апрача таго частку пазыкі мяркуецца перадаць крэдытнай каапэрацыі для пашырэньня крэдытаваньня сялян па сельскую электрыфікацыю.

Другая карысьць пазыкі—выйгрышы. Парламэнт СССР, прыняўшы пад увагу думкі сялян-выдзяленцаў, зьменшыў галоўныя выйгрышы ад 3.000 да 1.000, а агульную суму выйгрышаў павялічыў да 7 проц.

Пазыка выпушчана тэрмінам на 3 гады. Кожны год будуць два розыгрышы—адзін у студзені, другі ў кастрычніку.

У кожным тыражы будзе разыграна 40 выйгрышаў па 1.000 р., 200 выйгрышаў па 500 руб., 12.000 па 100 і 43.200 выйгрышаў—па 10 руб. Усяго ў кожным тыражы будзе разыгрывацца 55.440 выйгрышаў на суму 3.500.000 рублёў.

Калі падлічыць, то атрымаем, што за тры гады будзе разыграна 332.640 выйгрышаў на суму 21 мільёну рублёў, на кожныя 30 аблігацый прыпадзе адзін выйгрыш.

Для атрыманьня выйгрышаў па 50 і 100 руб. трэба аблігацыю перадаць у банк, ашчадную касу, фінадзел, крэдытныя таварыствы або паштовую ўстанову. Калі па аблігацыю папаў выйгрыш у 500 або 1.000 руб., то такія выйгрышы аплачваюцца праўленьнем Дзяржбанку ў Маскве.

Наступная выгада, якую дае пазыка—гэта—**прыбытак па купонах.** Кожная 10-рублёвая аблігацыя дае ў год 60 кап. прыбытку, а чвэртка аблігацыі—15 кап., пазыка выпушчана на 100 мільёнаў рублёў. Такім чынам на выплату купонаў дзяржава будзе траціць у год 6 мільёнаў рублёў, а за тры гады 18 мільёнаў. Пры кожнай аблігацыі ёсьць тры купоны—па адным купоне на кожны год. Па першым купоне можна атрымаць грошы, пачынаючы ад 1-га лютага 1929 г., па другім—ад 1-га лютага 1930 г., па трэцім—з 1-га лютага 1931 г.

Апошняя выгада, якую дае пазыка, заключаецца ў тым, што пачынаючы ад 1-га ліпеня 1929 г., аблігацыямі можна ўносіць сельскагаспадарчы падатак і плацяжы па дзяржаўным страхаваньні. Акрамя таго, аблігацыі прымаюцца ў заклад у дагаворах за аренду зямельных і лясных вучасткаў і г. д.

## Сельскую гаспадарку—на больш высокую ступень.

(Артыкул намесьніка наркамзему БССР тав. Каравікова).

Індустрыялізацыя краіны можа пасьпяхова разьвіваецца толькі тады, калі мацца база сырцу. Дзеля гэтага, побач з разгортваньнем прамысловага будаўніцтва, неабходна праводзіць мерапрыемствы па разьвіцьці тых галін сельскай гаспадаркі, якія эканамічна выгадны і карысны для сельскай гаспадаркі, надвышаюць яе прыбытковасьць і ствараюць базу сырцу для прамысловасьці.

Наша краіна адстала як у тэхнічных, так і агрыкультурных адносінах. Патрэбна калёсальнае напружаньне ўсіх сіл і сродкаў для таго, каб рэарганізаваць сельскую гаспадарку і ўзмацніць яе інтэнсыфікацыю. На гэтыя мерапрыемствы на дзяржаўным і мясцовым бюджэтах адпускаюцца вялікія сродкі, якія з году ў год павялічваюцца. Але гэтыя асигнаваньні ня могуць адпавядаць таму тэмпу разьвіцьця народнай гаспадаркі, які павінен значна палепшыць добрабыт працоўных гораду і вёскі.

Дзеля гэтага дзяржава выпускае пазыку ўзмацненьня сялянскай гаспадаркі, якая выключна ідзе на правядзеньне мерапрыемстваў у інтарэсах сельскай гаспадаркі і селяніна.

Кожны сьвядомы селянін ня можа ня ўзяць удзелу ў вялікай справе сацыялістычнага будаўніцтва на вёсцы.

БССР у пераважнасьці с.-г. краіна, у якой тэхніка гаспадаркі вельмі адстала, дзякуючы раду гістарычных умоў. Нам патрэбны вялікія сродкі, каб узьняць сельскую гаспадарку на больш высокую ступень.

Наркамзем упэўнен, што беларускае сялянства вразумее важнейшыя задачы пазыкі—палепшыць сельскую гаспадарку, палепшыць добрабыт сялянства. Мы спадзяемся, што сялянства, па прыкладу рабочай клясы, поўнасьцю рэалізуе **2 мільёны рублёў**, якія прыпадаюць на долю БССР.

# Па рабочых клюбах.

...„Варожаму ўплыву“ капіталістычных элемэнтаў рабочая кляса павінна супроцьпаставіць яшчэ большы ўздым актыўнасьці, самадзейнасьці і культурнасьці пралетарскіх мас“. *(З пастановы XV зьезду УсеКП(б).*

## Расьце попыт на беларускую літаратуру, а кніг не хапае.

**(Клюб савецкіх і гандлёвых служачых, Менск).**

Шмат людзей бывае ў гэтым клюбе. Частыя пастаноўкі, канцэрты, лекцыі прыцягваюць глядача. Толькі вечары большаю часткаю бываюць платныя. Таму і пастаноўкі наведвае спэцыфічная публіка: добра ўбраная, пя дрэнна аплачваемая.

Пры клюбе працуе літаратурны гурток, але работы яго не адчуваецца—няма адпаведнага кіраўніка.

З'арганізаваўся балетны гурток з 60 асоб, які будзе працаваць на самаапладе.

Прыцягнут спэцыялісты-кіраўнік да працы ў шашачна-шахматным гуртку. Членам гэтага гуртку неабходна было-б памятаць словы т. Бухарына: «Якультурнасьць можна выявіць шляхам простага падліку акуркаў, якія раскіданы на падлозе». І сапраўды, у памяшканьні гэтага гуртку вельмі накурана і на падлозе валяюцца сотні акуркаў.

Кепска стаіць справа з вайсковым гуртком. Ёсьць і асобнае памяшканьне, і адпаведная літаратура, і стралковы цір, толькі членаў гуртка цяжка прывабіць да гэтае справы. Для ўзьняцьця гэтай важнай працы спэцыяльна вылучаны Ёва члены праўленьня.

Добра працуе спартыўны гурток, у якім налічваецца 120 асоб. усьць і лыжная сэкцыя.

Прыемна адзначыць, што драмгурток перайшоў на беларускую мову. Першыя дзьве пастаноўкі «Чорт і баба» і «Два жаніхі» публіка спаткала з захапленьнем.

Больш чым у два разы павялічыўся попыт на беларускую літаратуру. «Часта з прычыны недахопу беларускіх кніг, прыходзіцца адмаўляць чытачом», — адзначае бібліятэкар.

Неабходна па гэту справу зьвярнуць належную ўвагу.

Новабытаў.

## 10 год клюбу чыгуначнікаў.

**(Клюб імя Леніна, Зах. чыгунак).**

У дні сьвяткаваньня 10-годзьдзя саюзу чыгуначнікаў Беларусі неабходна спыніцца на працы нашага клюбу.

Ён арганізаваўся ў першыя часы Кастрычніка на службе цягі. У 1920 г. палякі дашчэнту зруйнавалі гэты клюб.

У першыя гады пасьля ўходу палякаў ня было памяшканьняў, дзе можна было-б адчыніць клюб чыгуначнікаў. Саюз зьвярнуўся ў гарсавет і праз некаторы час атрымаў памяшканьне на Ленінградзкай вуліцы. У пачатку 1922 г. усе чыгуначнікі Менскага вузла Заходніх чыгунак урачыста сьвяткавалі адчыненьне клюбу, які быў названы імем Леніна.

Але гэты клюб ня мог абслугоўваць усіх членаў саюзу і іх утрымаць. Пасьля адрамантаваньня вакзалу саюз дабіўся пэраходу клюбу ў новае добра прыстасаванае памяшканьне. На працягу трох гадоў яно рамантавалася, рамонт скончыўся толькі ў 1924-м годзе.

Клюб абсталяваўся, стаў праводзіць шырокую масавую працу. У сучасны момант ён ахапляе 560 членаў саюзу. Бібліятэка-чытальня налічвае да 3.000 кніг. Працуюць некалькі гурткоў, якія прыцягваюць радавых рабочых.

Н. Крук

## Клюб будаўнікоў пашыраецца.

Сучаснае памяшканьне клюбу будаўнікоў у Менску далёка не здавальняе запатрабаваньняў членаў саюзу, якіх налічваецца ў горадзе да 5.000 чалавек.

Заля клюбу ўмяшчае толькі 200 з лішкам чалавек. Разгарнуць тут масавую працу вельмі цяжка.

Прэзыдыум ЦП саюзу пастанавіў спачатку адшукаць новае памяшканьне і знайшоў яго—гэта будынак старога касьцёлу на рагу вул. Энгельса і Кастрычнікавай. Але і гэта памяшканьне зьяўляецца не адпаведным з прычыны адсутнасьці пакояў для гурткоўае працы.

Саюз пастанавіў пашырыць цяперашняе памяшканьне і павялічыць залю да 1.000 месц. Праект прыбудовы і каштарыс ужо зацьверджаны. Агульная сума выдаткаў—75.000 руб.: ЦК саюзу адпускае 25.000, ЦП—10.000, а рэшту мяркуецца атрымаць у выглядзе доўгатэрміновай банкаўскай пазыкі. Будаўнічыя работы пачнуцца ўвесну гэтага году.

М.

## У ХЭМІКАЎ.

— Чарговы пленум праўленьня склікаецца 19-га студзеня. На пленуме будуць заслуханы даклады: цэнтральнага праўленьня, аб выніках каждагаворнай кампаніі, аб направоце і аб саюзным бюджэце.

— ЦП зацьвердзіла пастанову агульнага сходу рабочых гуты „Пралетары“ аб выключэньні з саюзу двух аборчыкаў членскіх узносаў—Бізюка і Хонскага за растрату саюзных грошай.

— ЦП пастанавіла перавесьці, як спробу, на крэдытныя функцыі касу ўзаемадапамогі гуты „Пралетары“.

— Рад беспрацоўных рабочых адмовіліся працаваць на гуце «Ільліч», якая нядаўна патрэбала. ЦП пастанавіла не выдаваць дапамогі ўсім тым, хто адмовіўся ад працы на гуце.

— 25-га лютага, за тры дні да ўсебеларускага зьезду хэмікаў, склікаецца канфэрэнцыя інжынэрна-тэхнічных працаўнікоў—членаў саюзу хэмікаў.

# ПА САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ

**па тэлеграфу, тэлефону і поштай ад нашых карэспандэнтаў**

## Чаму Лупалава ня ўносіць падатку?

**Найбагацейшы—першы... ад канца. Сельсаветчыкі самі ня ўносяць падатак.**

**Склад Хацкаўскага сельсавету адданы пад суд.**

МАГІЛЕЎ. (Уласн. кар.). Лупалаўскі раён па здачы падатку стаіць у акрузе першым... ад канца.

Чаму? Па эканамічным становішчы ён досыць моцны; калі ня лепшы, дык адзін з лепшых. Яшчэ за старою ўладаю па ім шырока прайшло земляўпарадкаваньне, не пакрыўджаны ён і савецкім земляўпарадкаваньнем.

Не, не эканамічнае становішча зьяўляецца прычынаю дрэннага выкананьня падатку, бо іншыя, больш слабыя раёны, здаюць падатак здавальняюча.

Няма падатковай дысцыпліны ў Лупалаўскім раёне.

Папершае, самі члены сельсаветаў ня ўносяць падатку. Які-ж, пасьля гэтага, будуць браць з іх прыклад сяляне?!

Падругое, няма і працы ад такіх сельсаветчыкаў. У часе здачы яны «чакаюць», што платнікі самі ўнясуць падатак, не арганізоўваюць калектыўнай здачы і г. д., а як скончыўся тэрмін—не прадстаўляюць сьпісаў неплатнікаў у райвыканком, як гэта належыць быць згодна інструкцыі.

У выніку, напрыклад, у Хацкаўскім сельсавеце лічыцца 57 процантаў няплатнікаў, а ў Антонаўскім і таго больш—62 проц.

Пленум райвыканкому, які разглядаў пытаньне аб падатку, ухваліў аддаць пад суд увесь склад членаў Хацкаўскага сельсавету, якія нядбайна аднесьліся да спагнаньня падатку і самі, як ад ін(!), ня ўнесьлі падатку за свае гаспадаркі.

Разам з тым, пленум прапанаваў членам райвыканкому выехаць у сельсаветы для праверкі працы па спагнаньні падатку. У выніку гэтае праверкі, мажліва, сядуць на лаўку падсудных і члены іншых сельсаветаў.

К. Л.

## Новы вадаправод у Магілеве.

**Артэзіянскія студні ці рачная вада?**

**(Ад нашага магілеўскага карэспандэнта).**

Памаленьку выконвае сваю паважную працу стары магілеўскі вадаправод па забесьпячэньні вадой цэнтральных частак гораду. Але... даўно ўжо просіцца на спакой наш стары, які прапрацаў звыш 60 год.

На зьмену яму павінен прыйсьці новы магутны вадаправод, кошт якога вызначаецца ў 1—1 з пал. мільёны рублёў, а тэрмін пабудовы—5 год. У мінулым годзе на яго было адпушчана 40 тысяч, сёлета прызначана 110 тысяч руб.

Ад шмат якіх фірм паступілі прапановы аб складаньні праекту пабудовы вадаправоду. З іх выдаецца адна—прамысловага аддзелу маскоўскага вышэйшага тэхнічнага вучылішча. Інжынэры адтуль бяруцца ня толькі склясьці, пад наглядам прафэсароў, праект, але і ўзяць на сябе яго выкананьне.

Прынята пастанова, каб у гэтым месяцы зрабіць умову з гэтай або з іншай фірмай.

Адкуль браць ваду для новага вадаправоду: з Дняпра або артэзіянскіх прабоін? Ухвалена—апошняе, бо артэзіянскія калодзежы дадуць ня толькі больш чыстую ваду, але і ў выстарчальнай колькасьці. Прадстаўнікі аддзелу аховы здароўя пераканаўча заявілі, што калі сучасны вадаправод (у 1916 годзе, калі ў нас была «стаўка») перайшоў з дняпроўскай вады па артэзіянскую, адразу зьменшыліся эпідэмічныя захворваньні.

З пабудоваю вадаправоду стаіць у цеснай сувязі і другое пытаньне—аб складаньні праекту пабудовы каналізацыі. Больш мэтазгодна, праводзячы выведы пры складаньні праекту пабудовы вадаправоду, у той-жа час скласьці і праект пабудовы ў нас каналізацыі.

К. Л—кі.

## Забесьпячэньне Гомелю мукой.

**Зьніжэньне цэн на жытні хлеб.**

ГОМЕЛЬ. Плян рэалізацыі хлебапрадуктаў за другую палову 1927 г. недавыкананы на 300.000 пудоў.

Тлумачыцца гэта тым, што за лік завозу хлебапрадуктаў завозіліся другарадныя культуры: авёс, вотрубі і г. д. Ня гледзячы, аднак, на недавыкананьне пляну, інвалідная каапэрацыя і саматужнікі забясьпечваліся мукой бесьперабойна.

Зараз канчаткова ўстаноўлена нармальная патрэбнасьць гараджога хлебапячэньня і местачковых саматужнікаў мукой. Саматужнікам мука адпускаецца пры ўмове продажу хлеба па ўстаноўленай цане. Цана на жытні хлеб з 1-га студзеня зьніжана на 1 к. за кілё.

## КАНФЭРЭНЦЫЯ СЯЛЯН-ЯЎРЗЯЎ.

**(Ад нашага слуцкага карэспандэнта).**

7 студзеня адбылася раённая канфэрэнцыя яўрэяў-земляробаў. На канфэрэнцыі былі 45 дэлегатаў ад усіх працоўных яўрэяў-земляробаў раёну.

У рэзалюцыі дэлегаты падкрэсьлілі неабходнасьць узмацненьня работы па абароне краіны і ўхвалілі пастанову: „Усім яўрэям-земляробам уступіць у рады Асоавіяхіму“.

Пытаньне аб выніках надзяленьня яўрэяў зямлёй і далейшых перспэктывах гэтае працы выклікала шмат выступленьняў дэлегатаў канфэрэнцыі. Канфэрэнцыя адзначыла як правільнасьць палітыкі партыі і савецкай ўлады, так і практычнае ажыцьцяўленьне мерапрыемстваў па дапамозе яўрэям-земляробам, надзяленьне працоўных яўрэяў зямлёю. Дэлегаты адзначалі дасягненьні ў раёне, зазначаючы па існаваньне ў раёне 6 калгасаў, аб'яднаючых яўрэяў-земляробаў, з якіх 1 калгас „Вызваленьне“ арганізован за апошнія месяцы. Таксама зазначалі на палепшаньне гаспадарчага становішча калгасаў, павялічэньне рабочай і малочнай жывёлы. Большасьць выступаўных дэлегатаў па гэтым пытаньні падкрэсьлівалі розьніцу між становішчам працоўных яўрэяў у замежных дзяржавах і ў Савецкай рэспубліцы, гаворачы, што нідзе працоўныя яўрэі ня могуць так спакойна вырашаць пытаньні свайго добрабыту. Адзначылі таксама, што за апошні час палепшыліся адносіны сялян-беларусаў да яўрэйскіх калектываў. Поруч з гэтым дэлегаты канкрэтна зазначылі на тыя заганы, якія яшчэ маюцца і перашкаджаюць пасьпяховаму будаўніцтву. Так, яшчэ ў некаторых мясцох назіраецца невыстарчальная ўвага сельсаветаў да яўрэйскіх калгасаў, невыстарчальная чудасьць у падыходзе да іх. Падкрэсьлівалі неабходнасьць водпуску доўгатэрміновага крэдыту.

Я.

# ЗА АБАРОНУ СССР.

## Дапрызыўная падрыхтоўка прайшла здавальняюча.

**(Гутарка з камандзірам №-ага корпусу тав. Лацісам).**

У часьцях №-ага корпусу закончылася дапрызыўная падрыхтоўка. У бягучым годзе яўка дапрызыўнікоў значна палепшылася. Настрой дапрызыўнікоў быў добры, усе выказвалі вялікае жаданьне навучацца вайсковай справе. Такія адносіны да падрыхтоўкі сьведчаць аб тым, што шырокія масы працоўных Беларусі **ўяўляюць** сабе небясьпеку нападу з боку капіталістычных краін, а з гэтага вынікае **неабходнасьць** рыхтавацца да абароны.

Вынік падрыхтоўкі дапрызыўнікоў можна лічыць зусім здавальняючым.

Адначасова з дапрызыўнай падрыхтоўкай праводзіліся ў тэрмінах аднадзённыя зборы тэрмінцаў. Трэба прызнаць, што па лініі як мясцовых арганізацый, так і вайсковых часьцей, ня ўсюды была праведзена выстарчальная падрыхтоўчая праца, у сувязі з чым у некаторых пунктах яўка была няпоўная.

Аднадзённым зборам у баявой сыстэме тэрчасьцей мы надаём вялікае значэньне. На будучы час неабходна завастрыць увагу ўсёй грамадзкасьці Беларусі і дабіцца 100 проц. акуратнай яўкі на аднадзённыя зборы.

На зборах адзначаецца вялікая зацікаўленасьць дапрызыўнікаў да праводзімай працы. Адначасова на аднадзённых зборах дапрызыўнікам былі даны задачы па вайсковых пытаньнях, якія яны павінны вырашыць паміж зборамі. Задача камскладу запасу—**дапамагчы** дапрызыўнікам сваімі паказаньнямі ў вырашэньні гэтых задач.

Прысад па сэсію ЦВК мною быў сумяшчоны в праверкай навучаньня ў часьцях №-кай дывізіі, Менскага гарнізону. Праверка паказала, што арганізацыя заняткаў як з камскладам, так і чырвонаармейцамі пастаўлена **зусім** здавальняюча і дае ўпэўненасьць, што часьці сапраўды ў баявых адносінах у бягучым навучальным годзе стануць на тую вышыню, як гэтага **патрабуе** напружанае міжнароднае становішча.

Ва ўсіх часьцях і гарнізонах створаны камісіі па падрыхтоўцы правядзеньня сьвяткаваньня 10-годзьдзя Чырвонай армії. У бягучым годзе, пры правядзеньні сьвяткаваньня, неабходна больш азнаёміць працоўныя масы пастаноўкамі дакладаў на рабочых сходах з нашымі дасягненьнямі за 10 год і аб тых задачах, якія стаяць перад працоўнымі масамі Беларусі ў справе вайсковай падрыхтоўкі.

## Аб сьвяткаваньні 10-цігодзьздзя Чырвонае армії.

**У сувязі з сьвяткаваньнем 10-годзьдзя Чырвонай армії ЦК КП(б)Б разаслаў усім акругкомам ліст, у якім, паміж іншым, гаворыцца:**

**1. Ва ўмовах напружаных міжнародных абставін і пагрозы новых войн юбілей Чырвонай армії павінен быць адзначан шырокай палітычнай кампаніяй, задачай якой зьяўляецца дэманстрацыя магутнасьці і ўзмацненьня ўзброеных сіл Савецкага Саюзу, дэманстрацыя непарыўнай сувязі Чырвонай армії з працоўнымі.**

**2. Вялізарнае палітычнае значэньне гэтай кампаніі патрабуе, каб усе партарганізацыі энэргічна прыступілі да правядзеньня адпаведных падрыхтоўчых арганізацыйна і агітацыйна-прапагандысцкіх мерапрыемстваў, мэтай якіх павінна быць прыцягненьне да 10-годзьзя Чырвонае армії самае шырокае грамадзкае думкі працоўных і далейшае ўзмацненьне ўвагі рабочых і сялян да справы абароны Савецкага Саюзу.**

**3. Цэнтральнай задачай усіх падрыхтоўчых мерапрыемстваў павінна быць уцягненьне ў сьвяткаваньне юбілею Чырвонай армії шырокіх колаў гораду і вёскі.**

**4. Асаблівая ўвага ў сьвяткаваньні павінна быць зьвернута на Асоавіяхім. Папулярызацыя ідэй Асоавіяхіму ёсьць найлепшая, найбольш рэальная форма ўдзелу рабочых і сялян у справе абароны краіны.**

**5. Цэнтральнай задачай удзелу ў кампаніі савецкіх і прафэсыйных арганізацый павінна быць усямернае ўзмацненьне сувязі рабочых і працоўнага сялянства з Чырвонай арміяй.**

**6. Па лініі камсамольскай арганізацыі неабходна дамагчыся самага шырокага ўцягненьня ў сьвяткаваньне гарадзкой і вясковай моладзі, арганізуючы сярод яе работу па ўцягненьні ў вайсковыя гуртки, спартыўныя і г. д.**

**7. Партыйныя арганізацыі павінны забясьпечыць самае шырокае разгортваньне навакол 10-й гадавіны Чырвонай армії агітацыйна-прапагандысцкай работы сярод насельніцтва, пачаўшы гэтую работу не позьней, чым за месяц да сьвяткаваньня.**

**8. Неабходна з асаблівай увагай адносіцца да ўцягненьня ў кампанію працоўных мас вёскі.**

## Праца з газэтай у галіне масавай вайсковай прапаганды.

На службу масавай вайсковай прапагандзе павінна быць, перш за ўсё, прыцягнута газэта. Разглядаючы новы нумар газэты, палітасьветнік-хатнік, бібліятэкар, чырвонакутнік павінны падумаць аб тым, што маецца ў нумары па пытаньнях ваеннай абароны, на што трэба зьвярнуць асаблівую ўвагу чытача. Такі матар'ял неабходна адзначаць, за тым прадумваць—у якім відзе, у якой форме яго падаць чытачу: гутаркі, чыткі, падкрэсьліваньні, складаньне альбомаў, газэтных выразак, плякатаў і г. д.

У працы з газэтай трэба найбольш шырока разгарнуць галосныя чыткі адзначаных газэтных артыкулаў. У вёсцы ў сьвяточныя дні чыткі могуць арганізоўвацца там, дзе зьбіраюцца сяляне: у хаце-чытальні, пардоме і г. д. Усякі выгодны выпадак, калі сабралася некалькі рабочых ці сялян, магчыма выкарыстаць для чыткі, гутаркі.

Для больш сталага азнаямленьня з пытаньнямі бягучага моманту мэтазгодна арганізаваць з актыўных сялян, моладзі, камсамольцаў групы супольнага чытаньня газэт. Працу гэтых груп неабходна паставіць так, каб яны зьбіраліся на вечарох, ці ў дзень у вольны час, і прачытвалі, разьбіралі найбольш важныя артыкулы аб бягучым моманце, аб абароне краіны і г. д.

Пры чытках газэт важна азнаёміць ня толькі з фактамі і пасобнымі весткамі, але і растлумачыць іх, зрабіць вывады аб тым, якое значэньне мае тая ці іншая вестка для нашай абароны.

М. Хвасьцюк.

**ДА ДЗЕСЯЦІГОДЗЬДЗЯ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ.**

# Пад кіраўніцтвам партыі будавалася і расла Чырвоная армія.

У грамадзянскай вайне мы перамаглі таму, што пад кіраўніцтвам партыі быў створан баявы саюз рабочых і сялян—Чырвоная армія.

Партыя бальшавікоў арганізавала ўсю рабоча-сялянскую краіну ў барацьбе з ворагамі рэвалюцыі. Партыя натхніла і ўзмацніла рады Чырвонай армії. Яна вяла іх у бой, будучы сама ў першых радох байцоў.

«Бяз партыі, жалезнай і загартаванай у барацьбе, бяз партыі, якая карыстаецца давер'ем усяго сумленнага ў данай клясе, бяз партыі, якая ўмее сачыць за настроямі масы і рабіць уплыў на яе, весьці пасьпяхова такую барацьбу немагчыма».

Так пісаў Ленін у красавіку 1920 году.

Партыя паслала ў армію большую частку сваіх сіл. Камуністыя ішлі на фронт у самыя трудныя моманты і ў самыя небясьпечныя месцы. Яны несьлі з сабою ў армію вытрыманасьць, мужтва, самаахвярнасьць, рэвалюцыйна-бальшавіцкую ўпартасьць і цьвёрдую дысцыпліну.

Партыйная арганізацыя ў Чырвонай армії, пя гледзячы па вялізарныя страты ў лютых бойках, блэўнынна расла за кошт беспартыйных байцоў і новых папаўненьняў, аб чым гаворыць лічба 300.000 камуністых у Чырвонай армії ў жніўні 1920 г. Гэты рост быў толькі таму, што камуністыя, не шкадуючы свайго жыцьця, ішлі ў гады грамадзянскай вайны ўперадзе з лёзунгамі, усяцела адпавядаючымі запатрабаваньням працоўных мас, і баранілі гэтыя лёзунгі, не шкадуючы свайго жыцьця.

Вось в якімі словамі тав. Ленін у кастрычніку 1919 году зьвяртаўся да камуністых, што адпраўляліся па фронт, калі армія Дзянікіна падыходзіла да Тулы: «для тых, хто ад'яжджае на фронт, як прадстаўнікі рабочых і сялян, выбару быць ня можа. Іх лёзунг павінен быць «сьмерць ці перамога».

Вось баявы заклік даны Леніным і партыяй камуністым, што ад'яжджалі на фронт.

Досыць ўспомніць толькі аб Гомельскім атрадзе байцоў. З 200 чалавек і з адным бранявіком уступіў ён у бойку з рэгулярнай і добра ўзброенай дывізіяй польскіх войск, паўстаўшых супроць савецкай улады. Бой ішоў каля 2 гадзін. Атрад загінуў цалком, бо супроць добра ўзброенай цэлай дывізіі 200 чалавек, ды яшчэ дрэнна ўзброеных,—нічога ня значаць. З 200 байцоў ніводзін не ўцалеў, але ніводзін не здаўся ворагу.

Вялікі недахват у спэцыялістых, які Чырвоная армія адчувала, партыяй быў таксама пераможаны. Спэцыялістых--былых афіцэраў, партыя прыцягнула да работы, прыставіўшы да іх лепшых, загартаваных у падпольнай рабоце бальшавікоў у якасьці камісараў.

Рэвалюцыя па ваенным пытаньні, ухваленая 8-ым зьездам нашай партыі ў сакавіку 1919 году наконт дзейнасьці васковых камісараў, вымагае цэнтралізаванага партыйна-палітычнага кантролю над вайсковымі спэцыялістымі (п. 2); на камісара ўскладалася пэрыядычнае складаньне атэстацый каманднага складу (п. 3); вырашэньне гаспадарча-адміністрацыйных пытаньняў, супольна з камандзірамі (п. 10).

Такім чынам, у гэтых абодвых дакумантах інстытут камісараў знаходзіцца ў непасрэднай сувязі з неабходнасьцю прыцягненьня старога афіцэрства на камандныя і адміністрацыйныя пасады.

Калі-б пралетарская рэвалюцыя мела сваіх рабочых камандзіраў з пачатку арганізацыі Чырвонай армії, дык патрэба ў інстытуце камісараў з функцыямі кантролю адпала-б. Перад партыяй стаяла-б толькі пытаньне аб арганізацыйных формах увязкі дзейнасьці партыйных арганізацый і партыяліторганаў з дзейнасьцю камандзіраў, у мэтах узгадненьня палітычнай работы з грамадзкаю, забесьпячэньня адзінства кіраўніцтва і праўленьня і асабістай адказнасьці.

Адгэтуль зразумела, чаму разам з ростам Чырвонай армії, палітычным узмацненьнем яе камандных кадраў функцыі камісараў паступова звужваюцца. Пастановы VIII зьезду партыі аб стварэньні з рабочых і сялян, на першых парах, хаця-б ніжэйшага каманднага складу, не засталіся пастановамі на паперы.

Цяпер начале дывізій, карпусоў стаяць 19 проц. рабочых, 40 проц. сялян, а з агульнай колькасьці—74 проц. членаў і кандыдатаў партыі. Вось чаму мы ўжо пераходзім на павялічэньне ліку адпаўладзтва ў Чырвонай армії, вось чаму страціў усялякі сэнс падзел камскладу на «спэцыялістых» і «чырвоных камандзіраў».

Усе гэтыя дасягненьні мы маем таму, што партыя ўвесь час удзяляла вялікую ўвагу кіраўніцтву і будаўніцтву Чырвонай армії.

На 10-й партыйнай канфэрэнцыі (у верасьні 1920 г.) таксама абгаворваліся пытаньні жыцьця і быту Чырвонай армії. Партыя паставіла перад армейскімі працаўнікамі выразную задачу: цясьней зьвязацца з беспартыйнай чырвонаармейскай масай, уважліва адносіцца да патрабаваньняў чырвонаармейцаў, узмацніць партыйна-палітасьветработу сярод іх.

10-ая партыйная канфэрэнцыя намеціла шэраг задач па ўзмацненьні ўплыву партыі сярод беспартыйнага складу арміі, паказаўшы шляхі ўзмацненьня сувязі паміж камандна-палітычным складам і чырвонаармейцамі. Бязумоўна, што ў гэтай галіне мы зараз маем вялікія дасягненьні.

10-ты зьезд партыі (сакавік 1921 г.) у адпаведнасьці з зьмяніўшыміся абставінамі высунуў перад арміяй шэраг новых задач. Камісары, палітработнікі набылі вялікі вопыт за час грамадзянскае вайны. Партыя ўзяла пад увагу гэтыя абставіны і 10-ы зьезд ухваліў: «Больш шырока ўжываць сыстэму пераводу на камандныя і адміністрацыйна-гаспадарчыя пасады камісараў, якія набылі адпаведны вопыт».

10-му зьезду было вразумела, што тэхнічную моц арміі неабходна і магчыма ўзмацніць. Па гэтым пытаньні ў пастановах 10-га зьезду ёсьць спэцыяльны пункт аб спэцчасьцях:

«Зьвярнуць выключную ўвагу на ўсе спэцыяльна-тэхнічныя часьці (артылерыйскія, кулямётныя, аўтабранявыя, авіяцыйныя, інжынэрныя, броне-цягавыя і інш.), забясьпечыць гэтыя часьці ўсімі неабходнымі прадметамі, як баявога, так і матар'яльна-гаспадарчага характару; ужыць усе меры да павышэньня палітычнага і баявога ўзроўню гэтых часьцей».

Да моманту XI зьезду партыі Чырвоная армія была намного скарочана. У зьвязку з гэтакім скарачэньнем з арміі вышла вялікая частка камуністых, каля 70.000 чалавек. Зьезд ухваліў вярнуць вялікую частку дэмабілізаваных камуністых назад у армію і, акрамя таго, дамагчыся прызыву ўсіх камуністых чарговага ўзросту ў армію. У выніку ўхвалы зьезду ў армію было ўліта 18.497 маладых камуністых.

На XII партыйным зьезьдзе партыя ўпяршыню паставіла пытаньне аб нацыянальным будаўніцтве Чырвонае армії. Па гэтым пытаньні зьездам было пастаноўлена: «зьезд рэкамэндуе членам партыі... дамагчыся таго, каб была ўзмоцнена выхаваўчая работа Чырвонай Арміі ў духу насаджэньня ідэй брацтва і салідарнасьці народаў Саюзу, і былі ўжыты практычныя мерапрыемствы па арганізацыі нацыянальных вайсковых часьцей...»

Зьезд паказаў, што ў раёнах, дзе часьці Чырвонае арміі разьмешчаны сярод нацменшасьцяй, трэба асабліва ўзмацніць сувязь Чырвонай арміі з працоўнымі гэтых нацыянальнасьцяй.

Шэраг пастаноў аб Чырвонай арміі ўхваліў і 13-ты зьезд партыі (май 1924 г.) Як ведама, ў гэты пэрыяд над кіраўніцтвам тав. Фрунзе праходзіла перабудова Чырвонай арміі. Зьезд даручыў Цэнтральнаму Камітэту ўжыць шэраг мер для павялічэньня ліку камуністых сярод чырвонаармейцаў і чырвонафлётцаў.

Як ведама, перад 13-м партыйным зьездам апазыцыя пыталася весьці фракцыйную работу ў Чырвонай арміі. Зьезд рашыў спробы «за весьці фракцыйную «работу» ў радох Чырвонай арміі пар тыя павінна карацць асабліва сурова».

Апазыцыя ў Чырвонай арміі пацярпела поўнае параджэньне. Яе прыхільнікі складаюць пікчэмную колькасьць—0,35 проц. усёй армейскай партыйнай арганізацыі.

Армейская партарганізацыя прадэманстравала сваю вернасьць ленінскаму ЦК, рашуча асудзіўшы раскольніцкую дзейнасьць апазыцыі.

Апазыцыянэры малююць Чырвоную армію, пя як узброеную апору дыктатуры пралетарыяту, а як армію перарадзіўшуюся, як армію, чужую пралетарыяту.

Партыйная арганізацыя Чырвонай арміі на гэткі паклёп адказала ўзмацненьнем работы па ўздыме баявой здольнасьці часьцей і дакладнай прапработкаю зьезданскіх матар'ялаў.

Кожны чырвонаармеец, кожны камандзір, партыйны і беспартыйны, зразумелі, што толькі ў ленінскім адзінстве партыйных радоў—забесьпячэньне магутнасьці і трываласьці Чырвонае арміі.

М. Шмідт.

# ГАЛОЎНАВУКА БССР.

## Структура і бліжэйшыя задачы.

*(Гутарка з старшынёю Галоўнавукі т. Некрашэвічам С. М.)*

Усе асноўныя навуковыя пытаньні Галоўнавукі будуць вырашацца яе навуковай радай, у склад якое ўваходзяць прадстаўнікі беларускіх навукова-дасьледчых устаноў, інспэктар вузаў і паасобныя высококваліфікаваныя прадстаўнікі розных галін навукі.

Начале навуковае рады стаіць старшыня Галоўнавукі.

У сваёй дзейнасьці Галоўнавука БССР павінна ўзгадняць і плянаваць навукова-дасьледчую працу як па БССР, так з саюзнымі Галоўнавукамі ва ўсесаюзным маштабе. Наша Галоўнавука разам з Саюзнымі Навукамі будзе імкнуцца, каб сетка саюзных навукова-дасьледчых устаноў усесаюзнага значэньня разгортвалася роўнамерна па тэрыторыі Савецкага Саюзу, і каб такім чынам гэтыя ўстановы адкрываліся ня толькі ў аднэй якой-небудзь савецкай рэспубліцы, але каб сетка іх больш-менш роўнамер на ахоплівала ўсе саюзныя рэспублікі, у тым ліку і Беларусь.

Бліжэйшыя задачы Галоўнавукі. Яна павінна ўпарадкаваць справу з асьпірантамі, выпрацаваўшы для іх патрэбныя праграмы працы і ўстанавіўшы кантроль за выкананьнем іх. Таксама маецца на ўвазе павялічыць лік асьпірантаў на, што ў бягучым бюджэтным годзе маюцца адпаведныя сродкі.

Некаторыя з навуковых працаўнікоў будуць камандураваны для кваліфікацыі ў навукова-дасьледчыя ўстановы СССР і за граніцу.

Будуць таксама зроблены захады для ўпарадкаваньня музэйнае справы ў сэнсе мэтавай устаноўкі кожнага з музэяў, асабліва гомельскага аддзяленьня.

З наступнага году мяркуецца заснаваньне навуковага аддзяленьня беларускае дзяржаўнае бібліятэкі ў Магілеве, дзе маецца багаты і вельмі каштоўны кніжны фонд.

Для азнаямленьня шырокіх колаў грамадзянства з беларускім арнамэнтам, узьнімаецца перад СНК пытаньне аб выданьні альбому арнамэнту беларускае тканіны і слуцкіх паясоў.

У галіне аховы мастацтва Галоўнавукай будуць зроблены захады як да выяўленьня помнікаў мастацтва і старасьветчыны, так і для іх аховы, бо апошняя пастаўлена была ў нас вельмі кепска.

Трохі лепш стаіць справа з аховаю прыроды. У гэтых адносінах багаты і вельмі цікавы Барысаўскі запаведнік.

З мэтаю навуковага вывучэньня і большай рацыянальнай пастаноўкі аховы гэтага запаведніка мяркуецца ўзьняць пытаньне аб перадачы яго пад загад Галоўнавукі.

Наогул Галоўнавука БССР будзе дбаць аб пашырэньні сеткі навукова-дасьледчых устаноў у Беларусі, у першую чаргу распрацоўваючы пляны заснаваньня тых навукова-дасьледчых устаноў, якіх вымагае разгортваньне прамысловасьці нашай краіны.

# У ІНБЕЛКУЛЬЦЕ.

### Новы расійска-беларускі слоўнік.

Члены Інбелкульту С. Некрашэвіч і М. Байкоў апрацавалі новы расійска-беларускі слоўнік, які зьмяшчае звыш 60 тысяч расійскіх слоў і зваротаў.

Слоўнік ужо закончаны друкаваньнем і займае звыш 700 старонак сярэдняга фармату.

### Падручнік беларускай мовы.

Згодна з празыдыумам метадычному [illegible] беларускі мовазнаўца М. Лесік складае падручнік беларускае мовы для чатырохгодзьдзі вучобы, элементы граматыкі і асновы беларускага правапісу.

### Вынікі польскай краязнаўчай экспэдыцыі.

Наладжаная ў лінеі мінулага году краязнаўчая экспэдыцыя польсэктару ІБК у Асьвейцкі раён і на гуту Глуша, Бабруйскае округі, сабрала цікавыя матар'ялы па польфольклёры і інш. Гэтыя матар'ялы зараз распрацоўваюцца і будуць выдрукаваны ў часопісе „Паўгодзік".

### Новыя тэрміналёгіі.

Інстытут навуковае мовы друкуе наступныя беларускія тэрміналёгіі: па глебазнаўстве, сельскай гаспадарцы, бухгальтэрыі, хэміі, мэдыцынскую тэрміналёгію (нэўралёгія).

Таксама пераглядаецца для новага дапоўненага і выпраўленага выданьня тэрміналёгіі па псыхалёгіі, лёгіцы, педагогіцы, па практыцы і тэорыі літаратурнага мастацтва. Апрацоўваецца вэтэрынарная тэрміналёгія.

### Распрацоўка правінцыялізмаў польскай гутаркі.

Польсэктар Інбелкульту прыступіў да распрацоўкі правінцыялізмаў польскае гутаркі на Беларусі, якіх сабрана каля 3.000.

### Польска-беларускі слоўнік.

Ноўзабаве пачне друкавацца польска-беларускі слоўнік, які будзе зьмяшчаць у сабе 60 тысяч слоў.

Гэты слоўнік складзены пісьменьнікам Альбэртам Паўловічам і рэдагуецца польсэктарам ІБК.

# МЕНСК

## Ліквідацыя конач-нага руху на цэнтральных вуліцах.

На ўчарашнім аб'яднаным пасяджэньні прэзыдыумаў Менскага гарсавету і акрвыканкому пастаноўлена спыніць коначны рух на вучастку пляц Волі—ст. Менск МБЛ чыг. Пакідаецца толькі адзін коначны рэйс пляц Волі—Парэспа.

У бліжэйшыя дні акрвыканком атрымае для Менску яшчэ 8 новых аўтабусаў.

## Другі ў СССР.

Канчаткова вырашана пытаньнё аб пабудове ў Менску другога е СССР жэлятынавага заводу для выкарыстаньня адкідаў скураное вытворчасьці.

У мінулым годзе трэстам „Жиркость" быў пушчан у Маскве першы ў Саюзе жэлятынавы завод.

Праект менскага заводу распрацоўваецца амэрыканскім спэцыялістым і ў бліжэйшы час будзе перададзены на зацьверджаньне адпаведным органам.

Завод будзе знаходзіцца пры гарбарні на Ляхаўцы. Усю яго прадукцыю мяркуецца экспартаваць за граніцу. Завод будзе вырабляць фота-жэлятыну, харчавую і тэхнічную жэлятыну высокай якасьці—клей. Ён будзе выпускаць прадукцыю на 500.000 руб. у год. Для заводу намечана пабудова вялікага каменнага будынку. Выпісваецца з-за граніцы абсталяваньне. Кошт будаўнічых работ і абсталяваньня вызначаецца арыентовачна ў 250 000 руб. У сакавіку будзе прыступлена да будаўнічых работ з такім разрахункам, каб закончыць іх у кастрычніку гэтага году.

## Першая партыя сала ў Намеччыну.

Белмясгандаль адправіў у Нямеччыну першую спробную партыю сала і шмальцу. Белмясгандаль намеран сыстэматычна экспартаваць гэты від тавараў на загравічны рынак.

## Арганізацыйнае пасяджэньне праўленьня Аўтадору.

Учора адбылося першае арганізацыйнае пасяджэньне праўленьня Аўтадору БССР, на якім быў абраны прэзыдыум у складзе наступных т. т.: старшыня—Сташэўскі, тав. старшыні — Арлоў, адказны сакратар—Іваноў А.

Праўленьне намецілa плян работ на бліжэйшы час, які будзе ўнесен на зацьверджаньне савета Аўтадору 15 студзеня. На гэтым-жа пасяджэньні абраны кіраўнікі шляховай, аўтатрактарнай і палітасьветнай сэкцый.

Часова праўленьне Аўтадору знаходзіцца ў памяшканьні сакратара праўленьня (вакзал МБЛ чыг. тэл. 330).

## За дзень.

**УСЕБЕЛАРУСКАЯ НАРАДА ІНСПЭКТАРОЎ АХОВЫ ЗДАРОЎЯ.** 15 студзеня ў Менску склікаецца ўсебеларуская нарада акруговых інспэктароў па ахове здароўя. У ліку іншых пытаньняў на нарадзе будзе разгледжан 5-гадовы плян будаўніцтва па ахове здароўя ў Беларусі.

**ПЕРАСЯЛЕНЬНЕ Ў КРЫМ.** Згодна атрыманага нараду Белкамвет у бліжэйшы час пераселяе у эўпатарыйскі раён з Менску 12 сем'яў працоўных яўрэяў.

**ВЫНІКІ КАЛДАГАВОРНАЙ КАМПАНІІ.** Прэзыдыум ЦСПСБ запрапанаваў усім ЦП саюзаю і АСПС прыступіць да падвядзеньня вынікаў перазаключэньня калдагавораў і прадставіць матар'ялы ў ЦСПСБ да 20 студзеня.

## IV пленум ЦК т-ва „Чырвонага Крыжу".

Сёньня ў памяшканьні ЦК Чырвонага Крыжу (вул. Карла Маркса, 3) пачынаецца а 6 гадзіне ўвечары IV пленум Цэнтральнага Камітэту т-ва Чырвонага Крыжу. Пры сучасных варунках разгортваньня чырвона-крыжнай працы, як сярод гарадзкога, так, асабліва, сярод вясковага насельніцтва, працы пленуму павінны мець выдатнае значэньне. Пленум мае заслухаць і абгаварыць справаздачу бюро ЦК за апошні пэрыяд і спэцыяльна спыніцца на пытаньні аб формах працы нізавых ячэек т-ва, на санітарнай падрыхтоўцы насельніцтва і пашырэньні Чырвонага Крыжу на транспарце.

Трэба сказаць, што рабоча-сялянская маса надзвычайна энэргічна адгукнулася на заклік Чырвонага Крыжу адносна санітарнай асьветы: па прадпрыемствах, пры ўстановах, пры жылтаварыствах і г. д.—заснаваліся па БССР звыш 250 гурткоў першае дапамогі, у якіх бяруць удзел некалькі тысяч актывістых Чырвонага Крыжу. Часта нехапае сродкаў і літаратуры, каб задаволіць гурткі ўсім патрэбным. Перакінулася гэтая праца і на вёску, дзе вясковая моладзь ахвотна ўступае ў сябры Чырвонага Крыжу.

Адно, чаго не хапае Чырвонаму Крыжу—гэта пашырэньня яго арганізацыі па транспарце і, у першую чаргу, на чыгунцы. Чыгункі БССР маюць да 50.000 рабочых, чаму неабходна прыцягнуць да працы ў Чырвоным Крыжы хаця-б 25 проц. гэтага ліку (гэткі процант ёсьць у Украінскім Чырв. Крыжы). Фактычна прыцягнута толькі каля $1^1/_2$ тысяч.

Апрача таго, пленум павінен абгаварыць пытаньне аб перавыбарнай кампаніі ў бягучым годзе, што павінна аднавіць працу Чырв. Крыжу на мясцох і акрасьліць шляхі разьвіцьця яго на бліжэйшую будучыню.

А. Цьвікевіч.

# Наш экран.

## „Выканаўцы" закону.

Літара закону, раваліцыйная мэтазгоднасьць і простыя чалавечыя адносіны. Гэтыя тры разуменьні часта даволі востра сутыкаюцца паміж сабой. Па законе, як быццам, усё правільна, а па сутнасьці дзікае кручкатворства.

Нядаўна на 15 зьезьдзе ЎсеКП(б) дэлегаты прывялі цікавы факт прыцягненьня да суду партыйца-рабочага за тое, што ў гады жорсткай грамадзянскай вайны ён сяго-таго з бандытаў расстраляў бяз суду.

Нашы кручкатворы ўчапіліся за букву закона, вусім забыўшы пра клясавую сутнасьць савецкага суду.

«Рэцівыя законьнікі» прыносяць часта больш шкоды, чым самыя яўныя парушыцелі закону. Аб іх магчыма і напісаў Крылоў сваю байку аб паслужлівым мядзьведзі, які абараняў пакой пустэльніка.

Абараняе закон і ўпоўнаважаны Менскай страхкасы ў Барысаве. Работніца хлебапякарні саўхозу Крупкі Галушка папрацавала 6 месяцаў бяз 20 дён. Прышоў час, калі ёй трэба была атрымаць водпуск па цяжарнасьці. Цяжка стала працаваць, штодзённа падымаць дзесяткі пудоў цеста. Кансультацыя выдала водпуск. Прышоў час...

Дайшла чарга да кампэнсацыі за час водпуску. Страхкаса катэгарычна адмовіла: «нельга... ня хапае 20-ці дзён... Закон, мілая, працоўны стаж... Карыстайцеся водпускам без кампэнсацыі».

Дзякуем за ласку!

Работніца знайшла выхад—яна згадзілася пачаць працу са некалькі дзён раней сканчэньня водпуску. Гэтым кампэнсуюцца некалькіх дзён да патрэбнага працстажу.

Што-ж парашылі нашы законьнікі? Яны адновіліся: «Нельга! Належыць 16 тыдняў ня менш... Узгроюць за гэта нас».

Галушка пайшла, нясолана хлябаўшы.

Закон «перамог». Па форме правільна, а па сутнасьці—жорсткі зьдзек.

## Дабрадзейны нач.

З форсам пад'яжджае начальнік Аршанскага акруговага спраўдому Кезік да цагельнага заводу. Яго суправаджае загадчык рабочае часьці Яваро́ўскі.

Каля толькі што адбудаванае цагельні сабраліся рабочыя, паміж імі зьняволеныя, якія таксама прымалі ўдзел у пабудове новага цагельнага заводу.

Кезік хоча набыць рэпутацыю добрага адміністратара і чулага таварыша ў адносінах да рабочых. Паглядзім, як ён выконвае гэтую бадай што непасільную для яго ролю.

Кезік сярод рабочых. Ён у кароткай прамове вітае рабочых з новаю пабудоваю, далей ідзе пажаданьне посьпеху ў працы на новым заводзе і ўрэшце «гасьцінец» для рабочых.

— Вось вам, хлопцы, на выпіўку за вашу стараннасьць,—кажа Кезік і нейкім асаблівым пачуцьцём самаздаволеньня і кідае на стол з кішэні некалькі крэдытак. Гэтая роля «дабрад ея» выканана. Кезік садзіцца ў вазок і гайда да дому. Па кіраўніцтве спраўдому потым быў адданы загад, каб грошы, патрачаныя на выпіўку, у зьвязку з пускам новага заводу, былі паказаны у графе выдаткаў за кошт рабочае часьці.

Ня думайце, што Кезік ня ветае канца і меры сваёй «дабраце». Ён і пра рэжым эканоміі не забывае.

Адпойчы загадчык рабочае часьці спраўдому з 5-цю зьняволенымі паехаў за 18 вёрст па дровы і, прабыўшы ў дарозе з людзьмі каля двох дзён, патраціў на харчаваньне 2 р. 75 к.

Як ні даводзіў сваю правату загадчык рабочае часьці Яваро́ўскі нічога не дапамагло. Рахунак урэшце ён мусіў аплаціць з свае кішэні, як «нерацыянальны» выдатак, па словах Кезіка.

Ёсьць і яшчэ шмат іншых недарэчнасьцяй у «дзейнасьці» Кезіка, як, напрыклад, безгаспадарчасьць і нядбайнасьць пры звальненьні і найме служачых, пры складаньні каштарысаў і плянаў на новыя пабудовы. «Карыснай дзейнасьцю» Кезіка, бязумоўна, зацікавіцца РСІ.

# БАЛЯЧКІ ЖЫЦЬЦА.

## У ВЭНЭРЫЧНЫМ ДЫСПАНСЭРЫ.

Па сьнежнай сьцежцы вузкага двара ад раніцы да позьняга вечару адзін за адным сьпяшаюцца хворыя. Жанчыны праз асобны ўваход ідуць управа, уверх, мужчыны—улева, уніз. Накіроўваюцца ў вэнэрычны дыспансэр.

Змагацца з вэнэрычнымі захворваньнямі цяжка. Закон аб прымусовым лячэньні, уведзены ў РСФСР, у нас ня можа быць праведзен. Выдаваць закон і не ажыцьцяўляць яго—няма сэнсу. Для барацьбы з ачагамі заразы патрэбны вялікія сродкі. Неабходна шпіталізаваць такіх. Але на 20-ці вэнэрычных ложках на ўвесь Менск далёка ня заедзеш, у той час, як для Менску неабходна ня менш 120 ложкаў (ложак на 1.000 чалавек жыхарства). У клініку накіроўваюць хворага, які падлягае бязумоўнай шпіталізацыі, а там ня прымаюць. Перапоўнена. Дыспансэр робіць усё, што можа. Штодня праз яго вэнэрычныя габінэты праходзіць звых 300 хворых. За 5 год прапушчана 13.356 чалавек, хворых сыфілісам і трыпэрам, пры 285.230 наведваньнях. Захворваньне вэнэрычнымі хваробамі ў Менску вялікае, складае для беларусаў—14,2 хворых па сыфілісе і 13,9—па трыпэры на 1.000 чалавек; для вялікарусаў—10 па сыфілісе і 11,4—па ганарэі; для палякаў—10,1 па сыфілісе і 12,4—па ганарэі і для яўрэяў—2,4 па сыфілісе і 4,9—па ганарэі.

Апроч асноўнай унутранай працы, дыспансэр абсьледаваў 387 устаноў, агледзеўшы 20.976 чалавек. Прачытана 727 лекцый, на якіх было 18.571 слухачоў. Вялікае ажыўленьне ў вэнэрычных габінэтах (асабліва сярод мужчын) назіраецца пасьля розных сьвятаў. Самы вялікі процант захворваньняў прыпадае на вясну і лета.

Лічбы сьведчаць аб тым, як многа зрабіў дыспансэр за 5 год свайго існаваньня. Мог-бы зрабіць больш, калі-б былі сродкі і патрэбная колькасьць ложкаў. Пытаньне аб павялічэньні вэнэрычных ложкаў нельга пакідаць нявырашаным. Яго трэба безадкладна вырашыць.

З.

# Падатковыя прыбыткі ў бюджэце БССР у 1927-28 г.

У бюджэце БССР на 1927-28 г., які ўнесен на зацьверджаньне II сэсіі ЦВК, падатковыя прыбыткі, разам з надаўнімі да дзяржаўных падаткаў у карысьць мясцовага бюджэту, складаюць 31 мільён руб. Лічба вялікая, вылічаная са значнай напружанасьцю, але тым ня менш, мы гэта сьцьвярджаем,—зусім рэальная і пэўная да паступленьня.

У цеснай сувязі з гэтай вялікай задачай знаходзіцца другая—плянавае бесьперабойнае харчаваньне дзяржаўнага і мясцовага бюджэту ў працягу ўсяго надыходзячага году.

На гэту апошнюю задачу неабходна зьвярнуць асаблівую ўвагу. Асноўнаю ўмоваю пасьпяховага яе вырашэньня зьяўляецца ўважлівасьць і энэргія падатковага апарату. Існуючыя падатковыя законы ў поўнай меры забясьпечваюць як безбалезнае выпяцьце з народнае гаспадаркі памянёнай вышэй сумы падаткаў, так і плянавае, бесьперабойнае паступленьне налічаных плацяжоў ад усіх катэгорый і груп плацельшчыкаў. Дзеля гэтага важна, каб апарат, які праводзіць гэтыя законы ў жыцьцё, правод іўбы іх з жале най цьвёрдасьцю і настойлівасьцю, маючы на ўвазе, што толькі пры гэтых умовах будзе забясьпечана плянавае выкананьне ўсіх народна-гаспадарчых задач, прадугледжаных бюджэтам.

Каб уявіць сабе яскравы малюнак тых труднасьцяй, з якімі прыдзецца спаткацца падатковаму апарату пры вырашэньні пастаўленых яму бюджэтам задач, неабходна хоць-бы ў агульных рысах устанавіць ступень удзелу важнейшых катэгорый плацельшчыкаў у рэалізацыі ўсяе сумы падатковых прыбыткаў.

Мы спынімся тут на гарадзкіх плацельшчыках. Каля 20 мільён. руб., улічваючы сюды надбаўкі ў мясцовы бюджэт, мы маем атрымаць па двух падатках—прамысловым і падаходным. Прыкладна, палова гэтае сумы прыпадае на дзяржаўныя і каапэрацыйныя арганізацыі і другая палова—на долю прыватных асоб. Труднасьці ў адносінах першае катэгорыі плацельшчыкаў, г. зн. дзяржаўных і каапэрацыйных арганізацый, заключаюцца ў тым, што гэтыя арганізацыі не навучыліся яшчэ своячасова ўносіць належачыя з іх падатковыя плацяжы. Звычайна атрымліваюцца розная роду хадайніцтвы аб адтэрмінаваньнях плацяжоў і г. д. Трэба проста сказаць, што пры ўзросшай удзельнай в зе плацяжоў дзяржаўных і каапэрацыйных арганізацый у агульнай суме асноўных падаткаў, **бесьперабойнае і плянавае выкананьне бюджэтных заданьняў магчыма толькі пры умове,** калі гэтая катэгорыя плацельшчыкаў своячасова і поўна будзе ўносіць належачыя з яе падаткі. Самая жорсткая і пасьлядоўная барацьба ва ўсіх выпадках парушэньня падатковае дысцыпліны дзяржаўнымі і каапэрацыйнымі арганізацыямі.

Значна большай па сваім разьмеры і характары труднасьцю зьяўляецца прыватны сэктар. Тут труднасьці пачынаюцца з моманту нарахаваньня падатку і канчаюцца толькі ў момант поўнага яго ўзносу. Трэба сказаць, што ня гледзячы на ўсе намаганьні апарату, накіраваныя да высьвятленьня сапраўдных зваротаў і прыбыткаў прыватных асоб, правільнасьць і паўнота абкладаньня іх застаецца яшчэ пад вялікім пытаньнем. Шмат чаго, бязумоўна, дасягнута ў гэтай справе. Але шмат чаго яшчэ трэба зрабіць. Падатковы апарат мае задачу: выявіць сапраўдны твар плацельшчыка падатку—яго сапраўдныя звороты і прыбыткі. Але гэты твар так добра замаскоўваецца, што выкрыць яго аднымі сваімі сіламі—справа надзвычайна цяжкая, а часта и ват немагчымая. Падатковаму апарату патрэбна ў гэтай справе вялікая дапамога ўсіх дзяржаўных і грамадзкіх органаў.

Наш аграмаджаны сэктар—дзяржаўныя і каапэрацыйныя арганізацыі павінны зразумець усю важнасьць і неабходнасьць своячасовай і поўнай аплаты сваіх падаткаў. Гэтым будуць дасягнуты адразу дзьве мэты: —папершае, плянавае выкананьне бюджэту і падругое — вызваленьне сіл падатковага апарату, такіх неабходных для барацьбы з прыватным сэктарам.

**Усе сілы, уся ўвага поўнаму і бесьперабойнаму выкананьню падатковых прыбыткаў, вызначаных бюджэтам 1927-28 году.**

М. Кардашэнка.

# СУД.

## Ашуканства.

Іскевіч доўгі час быў беспрацоўным і атрымліваў дапамогу ў страхкасе. 16-га мая 1927 году Іскевіч атрымаў пасаду ў Белдзяржстроі. Будучы на пасадзе, ён у той-жа самы час атрымліваў з страхкасы дапамогу па беспрацоўі.

Страхкаса даведалася, што Іскевіч працуе. Калі ён зьявіўся за атрыманьнем дапамогі па беспрацоўі, Іскевічу адказалі, што ім вядома, што ён працуе, і прапанавалі прынесьці спраўку з установы аб часе паступленьня на працу.

Белдзяржстрой выдаў Іскевічу спраўку, у якой указвалася, што Іскевіч прыступіў да працы 16-га мая. Жадаючы ўтаіць няправільнае атрыманьне дапамогі па беспрацоўі за той час, калі ён ужо працаваў, Іскевіч падчысьціў спраўку, напісаў, што ён паступіў на працу з 16 чэрвеня. У страхкасе зразу-ж кінулася ў вочы падчыстка і Іскевіч затрыман і перадан за ашуканства ў нарсуд 1-га вучастку.

На судзе Іскевіч у сваёй віноўнасьці сазнаецца, але жадаючы якнебудзь апраўдацца, ён пытаецца растлумачыць свой паступак цяжкім матар'яльным становішчам.

Нарсуд 1-га вучастку, разглядзеўшы справу, прыгаварыў Іскевіча за ашуканства і няправільнае атрыманьне грошай у страхкасе да 1-га году зьняволеньня. Прыстасаваўшы кастрычнікавую амністыю, суд ад кары яго вызваліў.

## Справа гандляроў.

У суботу, 14-га студзеня, а 11 гадз. дня, у клюбе саматужнікаў будзе слухацца ў паказальным парадку справа прыватных гандляроў аб перавышэньні цэн, устаноўленых Наркамгандлем.

Справа будзе разглядацца нарсудом 1-га вучастку пры ўдзеле абвініцеля і абаронцаў.

## Пры звароце з фэсту.

Гр. хутару Раньня Рэчка, Асінавіцкага раёну Корбут Віктар вайшоў на фэст у суседнюю вёску Смык. Там ён падвыпіў і ніяк ня мог дабрацца да сябе на хутар. Праз свайго знаёмага Сымона Восіпава Корбут папрасіў спяць тэй-жа вёскі Барысіка Янку і Саковіча Тодара адвезьці яго дадому. Сяляне згадзіліся.

На дарозе яны зьвярнулі ў лес, дзе пачалі душыць Корбута і забралі ў яго 96 р. 60 к. грошай і парсьцёнак, а потым выкінулі з воза і пасхалі назад у вёску.

Бабруйскі акруговы суд прыгаварыў Барысіка Я. і Саковіча Т. за разбойніцтва і набой да 5 год зьняволеньня з суровым алмежаваньнем кожнага. Але на кастрычнікавай амністыі гэта кара ім скарочана на палову. Акрамя даго канфіскавана сыскаць з Барысіка і Саковіча ў карысьць Корбута 218 р. 60 к. У гэтую суму ўваходзіць 98 р. 60 к., забраныя ў Корбута ў часе аграбленьня 30 руб. патрачаныя на лячэньне масьля набояў і 90 руб. на наём рабочае сілы ў часе хваробы.

Вярхоўны суд гэты прыгавар пакінуў у моцы.

# КІНО.

## „Вечная барацьба".

**(Кіно „Чырвоная Зорка").**

Можа здацца, што гутарка ідзе аб вечнай барацьбе паміж клясамі, народамі, групамі або чымсьці іншым у гэтым родзе.

Сапраўды-ж перад намі звычайны амэрыканскі фільм, які вічым амаль не адрозьніваецца ад соцень ранейшых амэрыканскіх карцін. Гутарка ідзе аб барацьбе толькі двух мужчын з-за дзяўчыны. Новае, што тут ёсьць, гэта фон, на якім разгортваецца дзея. Прыродныя здымкі поўначы, здымкі язды на сабаках, гор і наогул мясцовасьці даволі цікавыя.

Што-ж датычыць праблемы каханьня, то яна завостраная ў сярэдзіне фільму, вырашаецца па амэрыканску: гэрой і гэраіня застаюцца жывымі, жэняцца, а ўсе парадачныя людзі, што мелі хоць крыху дачыненьня да «барацьбы», таксама шчасьлівы.

У сэнсе мастацкасьці афармленьня фільму і ігры актораў—карціна выяўляе сярэднюю каштоўнасьць.

А.

## „Вір".

**(Кіно «Культура»).**

Бытавы сялянскі фільм на сучасную тэму. Сюжэт пабудованы на эканамічнай барацьбе сялян з прыватным млынаром—прадстаўніком кулацкіх элемэнтаў у вёсцы. Адначасова з гэтым, на фоне сыцыяльнага расслаеньня вёскі, у фільме паказаны рост вясковай грамадзкасьці, новы быт вёскі пераплецены з нязьнішчаным яшчэ старым укладам яе жыцьця, звычаяў, забабоннасьцяй і г. д.

Сяляне вёскі Луговішча дружна вядуць арганізаваную барацьбу супроць кулака Марозава і старшыні сельсавету Іванкова. У выніку іх сумесных дзеяў з селянінам-вылучэнцам Сьцяпанам, яны дабіваюцца пабудовы грамадзкага млына.

Па ходзе карціны былі пабудованы вялікая плаціна і млын, вакол якіх, галоўным чынам, і разгортваецца сюжэт. Эфэктна зьняты трукавыя сцэны ў вадзе.

Фільм мае, зразумела, недахопы, але ўсё-ж ён захоплівае і пераконвае.

Карціна добра адбівае сялянскую працу, барацьбу на вёсцы, яе вясельле і драмы і галоўнае яе бадзёрасьць. Адчуваецца здароўе, сіла і сьвежасьць.

Даны фільм—першы савецкі цікавы сялянскі фільм.

## Кіно ў масы.

Культаддзел ЦСПСБ і Белдзяржкіно распачалі падрыхтоўку да надыходзячай усесаюзнае нарады па пытаньнях кіно пры АПА Цк УсеКП(б).

У бліжэйшыя дні ў Менску адбудуцца шырокі сход культактыву—фабкомаў, культкамісій, праўленьняў клюбаў і г. д., на якіх будзе пастаўлен даклад аб выніках і перспэктывах кіно ў Беларусі.

З 12-га па 18 студзеня кіно-камісія ЦСПСБ наладжвае даклады аб кіно ў Беларусі ў 5-ці рабочых клюбах Менску—МБЛ чыг., харчавікоў, друкароў, будаўнікоў і гарбароў.

У заключэньне гэтай справаздачнай кампаніі Белдзяржкіно ў Доме Культуры адбудзецца заключны дыспут.

## Паведамленьні.

### Цэнтральны камуністычны клюб імя Карла Маркса.

**Пятніца.** 1) А 7 гадз. увеч. пасяджэньне пленуму праўленьня клюбу. Яўка абавязкова.

2) Заняткі гурткоў: струны, шахматна-шашачны.

3) Праводзіцца запіс у гурткі: струны, спартыўны.

— У пятніцу, 13 студзеня, а 7-й гадз. увечары ў памяшканьні Акругкому КП(б)Б (вул. Энгельса, 14 пакой) адбудуцца заняткі сэкцыі друку—пры дапасгацкіх сходах.

## Папраўка.

У газ. „Зьвязда" № 7 (2814) на 2-й старонцы ў артыкуле „Аб парткіраўніцтве і парт'ядры ў ЛКСМ" украліся памылкі. У 1-м абзацы 1-й калёнцы ў шостым радку пасьля слова „партыйных" прапушчана „ячэек", у 3 калёнцы 2-м абзацы надрукавана „трое сялянам з іх 2 камсамольцам", а павінна быць „37 сялянам з іх 23 камсамольцам".

**Адказны рэдактар Ян. ЯСЬМОЎ.**


# ТЭАТР, КІНО.

Беларускі Другі Дзяржаўны тэатр. — Нядзеля, 15 студзеня „КАЛЯ ТЭРАСЫ" драма ў 4 дзеях, з часоў 1917 году. Пачатак а 8 з палов. гадзіне

Кіно-тэатр „Культура" — Першы бытавы балвік „ВОДОВОРОТ". Звыш праграм: ХРОНІКА СОВКІНО № 108.

Кіно „Чырвоная Зорка". — ГРАНДЫЁЗНЫ АМЭРЫКАНСКІ БАЯВІК „ВЕЧНАЯ БОРЬБА", частацк. драма ў 6 часьц. Штодзённа 4 сэансы. СКОРО! | VARIETE | СКОРО!

Кіно „Пралетары". — „СПАРТАК" Штодзённа 4 сэансы: а 6, 7 з пал. 9 і 10 з пал. гадз. АНОНС! ЧАРГОВАЯ ПРАГРАМА „ВТОРАЯ ЖЕНА"

Кіно „Інтэрнацыянал". — ГРАНДЫЁЗНЫ МАСТАЦКІ ФІЛЬМ. па аповесьці Лермантава «Герой нашего времени» „БЭЛА", у 8 часьц.

У нядзелю, 15-га студзеня, аб 11 гадзіне раніцы ў малой залі клюбу К. Маркса адбудзецца чарговая лекцыя ў Нядзельным Камвузе НА ТЭМУ: „Ідэалізм і матэрыялізм". Лектар тав. ВЫДРА.

Літаратура да лекцыі:

ЭНГЕЛЬС—„Людвиг Фейербах", гл. 2. Прим. Плеханова № 7. Тезисы Маркса о Фейербахе.
ЛЕНИН—Материализм и эмпириокритицизм, гл. Вместо введения, т. X.
ЛЕНИН—Карл Маркс.
Л. ФЕЙЕРБАХ.—Сочинения, т. 1. Предварительные тезисы к реформе философии. Тезисы 1, 13, 16, 20, 34, 35, 36, 39, 40, 41 и 63.
ПЛЕХАНОВ—Предисловие к Деборину—Введение в философию диалектического материализма.
МАКСИМУМ:
Деборин—Введение в философию диалектического материализма—гл. о Беркли, Юме и Канте.
Архив Маркса и Энгельса, книга I—О немецком идеализме.

АПА Менкругкому КП(б)Б.
Праўленьне Нядзельнага Камвузу.

**Рабочая моладзь, камсамольцы!**

У панядзелак, 16-га студзеня, а 7-й гадзіне ўвечары, у памяшканьні КІНО „КУЛЬТУРА" рэд. газ. „Чырвоная Зьмена", клюб „КІМ" і фота—кіно—сэкцыя саюзу працасьветы арганізуюць

грандыёзны дыспут аб кіно:

„Вялікі нямы ці вялікі глухі"?

Уступнае слова скажа нарамасьветы БССР тав. БАЛІЦКІ.

У спрэчках выступяць т. т. Кнорын, Ігнатоўскі, Баранькінаў, Галавач, Ратнэр, Чарот, праф. Пічэта, праф. Вальфсон, праф. Шчанаціхін, Галнін, Табачнік, Гэршон і шэраг іншых таварышоў.

У файз—аркестр духавой музыкі. Білеты ў клюбе «КІМ».

Рудзянскі с.-совет (Мошенск. р. Витебск. окр.) ВЫЗЫВАЕТ на 29 января 1928 г. гр-на ЦАРЕВА Павла Константиновича по делу о расторжении брака с гр. МИСНИКОВОЙ ЕВДОНИЕЙ ДАВИДОВНОЙ. 471

В ОРШАНСКОЕ ОКРСТАТБЮРО ТРЕБУЕТСЯ СТАРШИЙ СТАТИСТИК, знающий промышленную статистику и труд. В предложениях указать прежнюю службу.

ЛАТСЕКЦИЯ устраивает в субботу, 14 января, В ДОМЕ КРАСНОЙ АРМИИ (ул. Энгельса) СЕМЕЙНЫЙ ВЕЧЕР.

В программе: пьеса, игры и танцы, духовой оркестр музыки. Начало в 8 час. вечера. Билеты у входа.

ЗАОЧНЫЕ ПРОМЫШЛЕННО-ЭКОНОМИЧЕСКИЕ КУРСЫ „ПОЛИГЛОТ" (Основ. в 1917 г.) состоящие в ведении С.-К. КрайОНО.

ПРЕДМЕТЫ ПРЕПОДАВАНИЯ:

бухгалтерия, коммерческ. вычисл., торг. корреспонд., делопроизводство, исправление почерка, техн.-худож. черчение, машиностроительное черчение, рисование, стенография и конструкц. (дефинитиф).

Занятия посредством переписки по почте специально составленными лекциями, ВПОЛНЕ ЗАМЕНЯЮЩИМИ УСТНОЕ ПРЕПОДАВАНИЕ. По окончании курса учащиеся подвергаются испытанию в специальн. квалифик. комиссии и получают соответствующее СВИДЕТЕЛЬСТВО.

На 1-е ноября 1927 г. на курсах состоит свыше 15.000 учащихся.

Плата посильная от 1 до 3 рублей.

Требуйте бесплатно проспекты, программы и условия.

Адрес: Ростов на Дону „ПОЛИГЛОТ".

АДКРЫТА ПАДПІСКА НА ЛЮТЫ М-Ц І ДА КАНЦА ГОДУ на бабруйскую акруговую сялянскую газэту „КАМУНІСТ", ОРГАН АКРУГКОМУ КП(б)Б і АКРВЫКАНКОМУ.

Выходзіць 3 разы ў тыдзень на 6 старонках.

Падпісная плата 25 кап. у м-ц. Падпісацца можна на любы тэрмін.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА:

у канторы газэты «КАМУНІСТ» (Бабруйск, сацыялістычная, 67), ва ўсіх паштова-тэл. канторах і аддзял. і ўсімі лістаносцамі.

470

Пасьведчаньне Паўловіча Б. І., выд. аб'яднаны прафшкоай. 1287
Матрыка Матусевіча У. І., выд. Мен. ЗАГС. 1288.
Лекавая кн. Кейгара Б. М., выд. Менстрахкасай. 1289.
Асабовае пасьведчаньне Хамекка Т. Д., выд. Станькаўскім с.-с. 1290.
Конская картка № 181 Парлюка Л. Л., выд. Магільнянскім с.-с. 19
Конская картка Калясоўскага А. 197
Пасьведчаньне № 520 Уса С., выд. Узьдзенскім РВК. 198
Асабовая картка Хапуновіча Л., выд. Старобінскім РВК. 199
Конская картка Кашаварава А. Н., выд. Лепельскім РВК. 200
Лавая кн. № 1187 Лопай Д., выд. Старобінскім спажывецкім т-вам. 201
Каапэрац. кн. Голад Л. Б., выд. МЦРК 202
Пенсыйн кн. Матох Ц. К., выд. Мазырскай страхкасай. 203
Асабовая картка Аўдзейчыка Д. Г. 204
Пашпарт № 102 Фрыд Е. А., выд. Заслаўскім РВК. 205

Каапэрац. кн. Дземітко Е. А., выд. МЦРК. 1276
Пашпарт Мурохи Г. А., выд. Мінміліцыяй. 1277.
Пашпарт Будай Ц. І., выд. Койданаўскім РВК. 1279.
Лекавая кн. Рубінскай В. І., выд. Менстрахкасай. 1280.
Пенсыйная кн. Германа Х. Н., выд. Заслаўск